Гос. Пуб. Биб-ка
УССР

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 17 (5993) | 21 студзеня 1938 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

Чатырнаццаць год таму назад перастала біцца сэрца настаўніка, правадыра, друга, вялікага генія працоўнага чалавецтва ВЛАДЗІМІРА ІЛЬЧА ЛЕНІНА.

Сцяг ЛЕНІНА высока падняў над нашай краінай і над усім светам яго найвярнейшы друг, вучань і саратнік, яго прадаўжальнік—наш любімы СТАЛІН. Ён пранёс гэты вялікі ленінскі сцяг скрозь годы ўпартай барацьбы з шматлікімі ворагамі партыі, рабочага класа і працоўнага сялянства. Ён захаваў незаплямленым непераможнае ленінскае вучэнне і развіў яго далей. Ён яшчэ больш шчыльна згуртаваў народы Совецкага Саюза пад сцягам соцыялізма. Ён неадступна вёў і вядзе краіну па ленінскаму шляху да ззяючых вяршынь комунізма.

Няхай жыве ЛЕНІНІЗМ!

Няхай жыве вялікі непераможны сцяг ЛЕНІНА—СТАЛІНА!

14 ГОД БЕЗ ЛЕНІНА, ПА ЛЕНІНСКАМУ ШЛЯХУ

Чатырнаццаць год прайшло з таго часу, калі перастала біцца сэрца таго, пад чым кіраўніцтвам стварылася і загартоўвалася партыя асаблівага тыпу — партыя большэвікоў, таго, хто арганізаваў рускі рабочы клас для звяржэння самаўладзтва і капіталізма, хто забяспечыў перамогу Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, пад чым кіраўніцтвам пабудавана і створана вялікая совецкая дзяржава.

14 год назад партыя, рабочы клас совецкай краіны, працоўныя і прыгнечаныя ўсяго свету страцілі Владзіміра Ільіча Леніна — найзялікшага генія чалавецтва, найвялікшага майстра і стратага пролетарскай рэволюцыі.

14 год наша вялікая соцыялістычная радзіма жыве без Леніна, несупынна следуючы яго вялікім заветам.

Ленін пакінуў нас у той перыяд, калі наша радзіма пачала толькі папраўляцца ад разбурэнняў, нанесеных імперыялістычнай і грамадзянскай вайной, калі яна была яшчэ жабракай, адсталай, некультурнай краінай. У сваёй славутай рабоце «Аб харчовым падатку» Ленін даў яркую характарыстыку таго, што ўяўляла сабою краіна Совецкіх у першыя годы пасля:

> «Паглядзіце на карту РСФСР. На поўнач ад Валагды, на паўднёвы ўсход ад Растова-на-Дану і ад Саратава, на поўдзень ад Оранбурга і ад Омска, на поўнач ад Томска ідуць неабсяжнейшыя прасторы, на якіх змясціліся-б дзесяткі велізарных культурных дзяржаў. І на ўсіх гэтых прасторах панаве патрыярхальшчына, поўдзікасць і самая сапраўдная дзікасць...»

Як далёка адышлі мы наперад за гэты час! Карэнныя, гіганцкія зрухі адбыліся ва ўсёй эканоміцы, быту і жыцці нашай радзімы!

У совецкай краіне канчаткова і беспаваротна перамог соцыялізм. «Эканамічную аснову СССР складаюць соцыялістычная сістэма гаспадаркі і соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці, якія ўмацаваліся ў рэзультаце ліквідацыі капіталістычнай сістэмы гаспадаркі, скасавання прыватнай уласнасці на прылады і сродкі вытворчасці і знішчэння эксплаатацыі чалавека чалавекам» — так гаворыць артыкул 4 Сталінскай Канстытуцыі, у якой падведзены вялікія вынікі гіганцкага шляху, пройдзенага Совецкім Саюзам. Перамога соцыялізма ў нашай краіне — перамога вялікай справы Леніна.

Ва ўсіх гістарычных поспехах соцыялізма, у трыумфе генеральнай лініі партыі — за ўсім відаць ўсёперамагаючая сіла ленінізма. «Мы перамаглі вернасцю ленінізму» **(Молатаў).**

Сцяг Леніна высока падняў над нашай краінай і над усім светам і панёс далёка наперад найвярнейшы друг, вучань і саратнік Ільіча — Сталін. Вялікі прадаўжальнік справы Леніна, ён пранёс ленінскі сцяг скрозь годы ўпартай барацьбы з ворагамі працоўных, скрозь эпоху сталінскіх пяцігодак, захаваў і развіў непераможнае ленінскае вучэнне. «Мы таму з такім поспехам праводзілі ў жыццё гэтыя ленінскія заветы, што ўсёй нашай справай, усёй нашай работай кіраваў дастойны прадаўжальнік справы Леніна, якому належыць заслуга развіцця ленінскіх ідэй аб соцыялістычнай рэволюцыі — наш Сталін» **(Молатаў).**

Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна партыя разграміла ўсіх ворагаў большэвізма, ворагаў рабочага класа, усіх тых, хто хацеў пасля смерці Леніна пахіснуць маналітнае адзінства большэвіцкіх радоў. Партыя выкрыла гнусных і подлых здраднікаў—трацкістаў, зіноўеўцаў і рыкаўцаў, якія пераўтварыліся ў агідную банду шпіёнаў і дыверсантаў — агентаў фашысцкіх аховранак.

Владзімір Ільіч Ленін ясна, з геніяльнай празорлівасцю бачыў шлях перамог соцыялізма. Стварыць магутную індустрыю, здольную перабудаваць і сельскую гаспадарку, даць вёсны тысячы машын, уцягнуць сялянства ў кааперавараныя формы сельскагаспадарчай вытворчасці — вось які шлях паказаў Ленін.

Партыя Леніна—Сталіна, рабочы клас і сялянства СССР могуць з гонарам сказаць, што гэта ўказанне Владзіміра Ільіча было іх пуцяводнай зоркай у барацьбе за соцыялізм, што гэтае ўказанне яны з поспехам выканалі. Ажыццявілася заветная мара Ільіча: «... перасесці, гаворачы фігуральна, з аднаго каня на другога, іменна, з каня сялянскага, мужыцкага, змізэрнелага, з каня эканомій, разлічаных на зруйнаваную сялянскую краіну, — на каня, якога шукае і не можа не шукаць для сябе пролетарыят, на каня буйнай машыннай індустрыі, электрыфікацыі, Волхаўбуда і т. д.».

Ва ўпартай, няўтомнай барацьбе з шматлікімі ворагамі забяспечана сталінская індустрыялізацыя краіны, — аснова заваявання эканамічнай незалежнасці краіны, аснова рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі апошняга эксплаататарскага класа — кулацтва. Совецкі Саюз стаў магутнай індустрыяльнай краінай, краінай самага перадавога ў свеце буйнага соцыялістычнага земляробства, краінай перадавой тэхнікі, найбагацейшай суседнай дзяржавай.

СССР заняў другое месца ў свеце па ўзроўню прамысловай прадукцыі. Аб'ём вытворчасці нашых соцыялістычных фабрык і заводаў больш чым у восем разоў перавышае аб'ём вытворчасці даваеннай прамысловасці. За перыяд двух сталінскіх пяцігодак выраслі сотні гігантаў індустрыі, роўных якім няма ў свеце.

У сельскай гаспадарцы нашай краіны на месцы двух дзесяткаў мільёнаў дробных адналасобных гаспадарак з прымітыўнай тэхнікай выраслі буйныя соцыялістычныя гаспадаркі — звыш 243 тысяч калгасаў, багата забяспечаных рознымі машынамі.

Жалезнай спяной на варце мірнай, радаснай працы, на варце сталінскай дружбы народаў стаіць магутная, непераможная Чырвоная Армія і ваенна-морскі флот. Узначальваемая жалезным палкаводцам, маршалам К. Е. Варашылавым, акружаная любоўю і клопатамі партыі і народа, аснашчоная самай перадавой тэхнікай, Чырвоная Армія ўяўляе сабой грозную, страшную для ворагаў, няломную сілу.

На жалобным пасяджэнні II Усесаюзнага з'езда Совецкіх таварыш Сталін у сваёй выдатнай, хвалюючай прамове даў клятву свята і няўхільна выконваць заветы Леніна. Гэта клятва вялікага правадыра ажыццёўлена з гонарам.

14-ю галавіну з дня смерці Леніна наша краіна сустракае пад непераможным сцягам Сталінскай Канстытуцыі, самай дэмакратычнай Канстытуцыі ў свеце. У нас перамагла разгорнутая соцыялістычная дэмакратыя, дэмакратыя для ўсіх грамадзян, сапраўднае народаўладства, увасобленае ў вышэйшым органе совецкай улады — Вярхоўным Совеце СССР. Здзейсніліся мудрыя прадбачанні Владзіміра Ільіча.

Памятаць, ніколі не адступаць ад ленінскіх заветаў, вз ўсім браць прыклад з Леніна, — гэтаму вучыць партыю і народ найвялікшы чалавек нашай эпохі, які, «ні на крок не адступаючы ад ленінскіх заветаў, перамагаючы ўсе труднасці, кіруючы нашай партыяй, кіруючы народамі нашай краіны, змог не толькі захаваць ленінскую спадчыну, але і ва многа, многа разоў гэтую спадчыну прыўмножыць» **(Ежоў).**

Гэты чалавек — наш вялікі правадыр і настаўнік таварыш Сталін.

Пад сцягам Леніна—Сталіна наша краіна ідзе наперад па шляху да новых і новых перамог.

В. І. ЛЕНІН у Разліве.

Скульптура Пінчука.



Помните, любите, изучайте Ильича, нашего учителя, нашего вождя. Борьба с побеждайте врагов, внутренних и внешних, — по Ильичу.

Строите новую жизнь, новый быт, новую культуру — по Ильичу. Никогда не отказывайтесь от малого в работе, ибо из малого строится великое, — в этом одном из важнейших заветов Ильича.

И. Сталин

Факсіміле пісьма таварыша І. В. Сталіна, змешчанага ў «Рабочей газете» ў гадавіну смерці В. І. Леніна (1925 год).

(Цэнтральны музей РСЧА).

ВЫБАРШЧЫКІ, НАРОД ПАВІННЫ ПАТРАБАВАЦЬ АД СВАІХ ДЭПУТАТАЎ, КАБ ЯНЫ АСТАВАЛІСЯ НА ВЫШЫНІ СВАІХ ЗАДАЧ, КАБ ЯНЫ Ў СВАЁЙ РАБОЦЕ НЕ СПУСКАЛІСЯ ДА ЎЗРОЎНЮ ПАЛІТЫЧНЫХ АБЫВАЦЕЛЯЎ, КАБ ЯНЫ АСТАВАЛІСЯ НА ПАСТУ ПАЛІТЫЧНЫХ ДЗЕЯЧОЎ ЛЕНІНСКАГА ТЫПУ, КАБ ЯНЫ БЫЛІ ТАКІМІ-Ж ЯСНЫМІ І ПЭЎНЫМІ ДЗЕЯЧАМІ, ЯК ЛЕНІН, КАБ ЯНЫ БЫЛІ ТАКІМІ-Ж БЯССТРАШНЫМІ Ў БАЮ І БЯЗЛІТАСНЫМІ ДА ВОРАГАЎ НАРОДА, ЯКІМ БЫЎ ЛЕНІН, КАБ ЯНЫ БЫЛІ СВАБОДНЫ АД УСЯКАЙ ПАНІКІ, АД УСЯКАГА ПАДАБЕНСТВА ПАНІКІ, КАЛІ СПРАВА ПАЧЫНАЕ ЎСКЛАДНЯЦЦА І НА ГАРЫЗОНЦЕ ВЫРЫСОЎВАЕЦЦА ЯКАЯ-НЕБУДЗЬ НЕБЯСПЕКА, КАБ ЯНЫ БЫЛІ ТАКСАМА СВАБОДНЫ АД УСЯКАГА ПАДАБЕНСТВА ПАНІКІ, ЯК БЫЎ СВАБОДНЫ ЛЕНІН, КАБ ЯНЫ БЫЛІ ГЭТАК-ЖА МУДРЫ І НЕПАСПЕШЛІВЫ ПРЫ ВЫРАШЭННІ СКЛАДАНЫХ ПЫТАННЯЎ, ДЗЕ ПАТРЭБНА ЎСЕБАКОВАЯ АРЫЕНТАЦЫЯ І ЎСЕБАКОВЫ ЎЛІК УСІХ ПЛЮСАЎ І МІНУСАЎ, ЯКІМ БЫЎ ЛЕНІН, КАБ ЯНЫ БЫЛІ ГЭТАК-ЖА ПРАЎДЗІВЫ І ЧЭСНЫ, ЯКІМ БЫЎ ЛЕНІН, КАБ ЯНЫ ГЭТАК-ЖА ЛЮБІЛІ СВОЙ НАРОД, ЯК ЛЮБІЎ ЯГО ЛЕНІН.

(З прамовы таварыша СТАЛІНА на перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы 11 снежня 1937 года ў Вялікім тэатры).

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

Прамова тав. В. М. МОЛАТАВА аб утварэнні ўрада СССР

(Калі старшынствуючы прадастаўляе слова таварышу Молатаву, усе прысутныя ў зале ўстаюць, бурна апладыруюць. Апладысменты пераходзяць у авацыю, авацыя працягваецца некалькі мінут. Нясуцца воклічы з месц: «Бліжэйшаму саратніку таварыша Сталіна — таварышу Молатаву — Ура!». Бурныя апладысменты, воклічы «Ура!»).

Таварышы дэпутаты! Вярхоўны Совет даручыў мне прадставіць на зацвярджэнне склад Совета Народных Камісараў. У гэтым сваім рашэнні Вярхоўны Совет прапанаваў улічыць крытычныя заўвагі, выказаныя дэпутатамі ў ходзе спрэчак па пытанню аб утварэнні ўрада. Зразумела, з гэтага і будуць выходзіць мае прапановы.

Перш чым перайсці да складу Совета Народных Камісараў, мне прыдзецца спынівіца на тых крытычных заўвагах, якія тут былі выказаны дэпутатамі Ждановым, Багіравым і Касіорам. Гэтыя таварышы ў сваіх прамовах спыніліся на рабоце раду наркаматаў, і я павінен сказаць, што з іх крытычнымі заўвагамі Совет Народных Камісараў палкам згодзен.

Пачну з пытання аб некаторых баках работы Народнага Камісарыята Замежных Спраў. На што тут было ўказана? Тав. Жданаў адзначыў, што Вярхоўны Совет і ён, як прадстаўнік працоўных Ленінграда, поўнасцю падтрымліваюць праводзімую совецкім урадам знешнюю палітыку, якая нам забяспечвае мір, якая паспяхова абараняецца і практычна праводзіцца Народным Камісарыятам Замежных Спраў. Але ён указаў і на некаторыя моманты, якія нельга не лічыць пенязымі бакамі ў гэтай вобласці.

Вось, напрыклад, пытанне аб замежных консулах у Совецкім Саюзе.

Трэба прызнаць, што гэтым пытаннем у належнай меры мы не займаліся да апошняга часу. Між тым, гэтае пытанне заслугоўвае ўвагі, і, вядома, у першую чаргу ўвагі Народнага Камісарыята Замежных Спраў. Сапраўды, у Совецкім Саюзе аказаліся ў лішку замежныя консульствы ў раду дзяржаў, якія нічым не заслужылі асобага становішча і перавагі ў адносінах да іншых дзяржаў. Некаторыя з замежных дзяржаў, і ў тым ліку з такіх, якія ніяк нельга прызнаць прыяцельскімі да Совецкага Саюза, мелі гэтых консульстваў значна больш, чым Совецкі Саюз меў у гэтых дзяржавах. Паўстае пытанне, на якой гэта падставе?

Правільна і тое, што некаторыя замежныя консулы займаліся ў нашай краіне недазволенымі справамі, займаліся зарожымі, антысовецкімі справамі шпіёнскага і шкодніцкага характару. Далей цярпець такое становішча безумоўна нельта.

Для ўнясення поўнай яснасці ў гэтае пытанне я павінен паведаміць, што некаторыя меры ў гэтых адносінах ужо прыняты. Закрыта пара японскіх консульстваў, у Новасібірску і Одэсе. Закрыта таксама пара польскіх консульстваў, у Харкаве і Тбілісі. Закрыты 5 германскіх консульстваў: у Ленінградзе, Харкаве, Одэсе, Тбілісі і Владзівастоку. Да 15 студзеня гэта ўжо было ажыццёўлена. Належыць закрыццю і рад іншых консульстваў. Належыць закрыццю рад консульстваў Італіі, Ірана, Турцыі, Афганістана, Латвіі і іншых краін.

Заўвагі тав. Жданава адносна замежных консульстваў, дружна падтрыманыя ўсім Вярхоўным Советам, Совет Народных Камісараў поўнасцю ўлічыць і правядзе ўсе належныя меры ў гэтых адносінах у бліжэйшы-ж час. **(Апладысменты).**

Тут зроблены былі таксама заўвагі адносна нашых узаемаадносін з двума дзяржавамі, — з Японіяй і з Францыяй.

Перш за ўсё, наконт нашых узаемаадносін з Японіяй і наконт паводзін некаторых беспарамонных агентаў японскага ўрада і небезвядомага, але сапраўды марыянетачнага Манчжоу-Го.

Вы ведаеце, таварышы, што совецкаму ўраду прыходзілася не раз пратэставаць супроць некаторых недапушчальных дзеянняў з боку японскіх і манчжурскіх улад. Ніхто ў Совецкім Саюзе без абурэння не можа глядзець на тыя беспарамонныя прыёмы з боку японска-манчжурскіх улад, якія яны ўжываюць, напрыклад, цяпер у адносінах аднаго паштовага самалёта грамадзянскай авіяцыі на Далёкім Усходзе, заблудзіўшагася ў дарозе і выпадкова сеўшага на тэрыторыі Манчжоу-Го. Роўна месяц таму назад 19 снежня меў месца гэты факт, факт захвату нашага паштовага самалёта, захвату двух совецкіх людзей—лётчыка і яго памочніка — і захвату шматлікай паштовай карэспандэнцыі, якая была на гэтым самалёце. Але да гэтага часу мы не маем ніякіх паведамленняў па гэтаму поваду ад японскага ўрада, не гледзячы на неаднаразовыя запросы і ў Токіо і ў Манчжоу-Го.

Совецкі ўрад вымушан быў 16 студзеня паслаць накіраваную да японскага ўрада ноту пратэсту супроць недапушчальных і незаконных дзеянняў япона-манчжурскіх улад. У гэтай ноце мы катэгарычна настойваем на неадкладным вызваленні затрыманых совецкіх грамадзян і на звароце самалёта і пошты, папярэджваючы японскі ўрад аб тым, каб ён не прымусіў нас стаць на шлях адказных рапрэсалій. Мы разлічваем, што эможам поўнасцю забяспечыць інтарэсы Совецкага Саюза супроць такіх і ўсякіх іншых беспарамонных дзеянняў замежных дзяржаў. Мы можам запэўніць вас, таварышы, у тым, што ўсе тыя меры, якія патрабуюцца з нашага боку, мы сапраўды правядзем. **(Працягныя апладысменты).**

Некалькі слоў аб нашых узаемаадносінах з Францыяй. Зноў-такі нельга не прызнаць грунтоўнасці заўваг тав. Жданава. Сапраўды, да сучаснага моманту, не гледзячы на наяўнасць прыязных адносін паміж Совецкім Саюзам і Французскай рэспублікай, на тэрыторыі Францыі знаходзяць сабе ўсялякі прытулак такія авантурысты і такія злачынныя арганізацыі, якія з'яўляюцца нічым іншым, як змяніўшымі гнёздамі тэрарыстаў і дыверсантаў, якія адкрыта займаюцца гэтымі сваімі варожымі антысовецкімі спразамі на вачах і пад апекай французскіх улад. Вядома, гэта нельга апраўдаць правам прытулку для іншакраінцаў. Паўстае пытанне, каму патрэбна гэта заахвочванне ўсякага роду злачынцаў, рускага і нярускага буржуазнага паходжання, якія займаюцца антысовецкімі тэрарыстычнымі справамі па французскай тэрыторыі і адкрыта падрыхтоўваюць свае злачынныя справы супроць совецкіх дзеячоў, супроць совецкіх органаў? Чаму гэтых паноў так заахвочваюць ва Францыі і як гэта адпавядае прыязнаму совецка-французскаму пакту? Гэтым пытаннем безумоўна прызнецца заняцца нашаму Народнаму Камісарыяту Замежных Спраў.

Вярхоўны Совет не палічыў магчымым прайсці міма гэтых абураючых і накіраваных супроць Совецкага Саюза фактаў. Нельга не згадзіцца з тым, што ён меў да гэтага поўную падставу. Соўнарком улічыць зробленыя на Сесіі Вярхоўнага Совета заўвагі па гэтаму пытанню і дасць адпаведныя ўказанні Народнаму Камісарыяту Замежных Спраў.

Тут былі закрануты таксама і пытанні, якія адносяцца да работы іншых Народных Камісарыятаў.

Тав. Жданаў адзначыў недахопы ў рабоце Народнага Камісарыята Воднага Транспарта. Сапраўды, часу прайшло нямала для таго, каб Наркамзод прыняў меры і зрушыўся з мелі, на якую ён сеў яшчэ ў пазамінулым межаводным годзе. Як Соўнарком ні дапамагаў Народнаму Камісарыяту Воднага Транспарта злезці з гэтай мелі, пакуль нам не ўдалося гэтага дабіцца. Кіраўніцтва Наркамвода празмерна марудна раскачваецца і пакуль не забяспечвае належнага паляпшэння ў рабоце. Нагомнім таварышам з Наркамвода, што хутка пачынаецца новая навігацыя, яна пачнецца ўсяго праз якіх-небудзь 2—3 месяцы. Гэта будзе апошняе выпрабаванне для цяперашніх кіраўнікоў Наркамвода. Яшчэ не позна, каб тав. Пахомаў, нарком воднага транспарта, выправіў становішча, заняўся па-сапраўднаму рамонтам суднаў, разгарнуў рашучую барацьбу з аварыямі, па-сапраўднаму узяўся за ліквідацыю стратнасці воднага транспарта, з галоўнае—за падбор і выхаванне кадраў воднага транспарта. Кіраўніцтва Наркамвода атрымала тут сур'ёзнае папярэджанне, і калі яно быстра не выправіць сваю работу, яно павінна будзе наракаць на сябе. Таварышы воднікі, сярод якіх нямала добрых работнікаў і сапраўдных стаханаўцаў, павінны паказаць сваё ўменне выпраўляць недахопы і пазбыць ў 1938 годзе так палняць сваю работу, як гэта належыць перадавым транспартнікам і сапраўдным будаўнікам социялізма.

Больш рэзка тут былі падкрэслены недахопы трох агульнасаюзных органаў, а іменна: Наркамюста, Камітэта загатовак і Камітэта мастацтваў.

Нельга не прызнаць прамову тав. Багірава зусім аб'ектыўнай. Ён указаў у адносінах тав. Крыленка, наркома юстыцыі, не толькі на недахопы, але і на ста-

(Працяг на 2-й стар.).

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ЗА МЯЖОЙ

ІСПАНІЯ

БАРСЕЛОНА, 20 студзеня. (БЕЛТА). Газета «Мундо обрэро» друкуе адозву Мадрыдскага правінцыяльнага камітэта компартыі ў сувязі з 14-й гадавінай з дня смерці Леніна. У адозве гаворыцца, што пролетарыят усяго свету з пачцівасцю ўшаноўвае памяць Леніна — геніяльнага барацьбіта за справу рабочага класа. У адозве падкрэсліваецца, што іспанскі пролетарыят павінен паказаць сябе дастойным той адказнай ролі, якая выпала на яго долю ў барацьбе з міжнародным фашызмам.

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 19 студзеня. (БЕЛТА). У Парыжы адбыўся арганізаваны компартыяй упушальны мітынг, прысвечаны 14-й гадавіне з дня смерці Леніна. На мітынгу выступіў з прамовай Марсель Кашэн. У сваёй прамове ён сказаў: «Незабыўны прыклад Леніна павінен кіраваць намі ў нашай барацьбе супроць ворагаў народа. Будзем вучыцца ў Леніна і ў Сталіна, геніяльнага прадаўжальніка справы Леніна, як трэба весці рабочы клас па шляху добрабыту, культуры і міру».

НА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ ПА ПЫТАННЯХ АГІТАЦЫІ І ПРАПАГАНДЫ

19 студзеня, у 6 гадзін вечара, у Доме Чырвонай Арміі імя першага маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава пачала сваю работу, скліканая ЦК КП(б)Б усебеларуская нарада культпропаў акруткомаў, гаркомаў, райкомаў партыі і загадчыкаў парткабінетаў. Прысутнічае каля 200 чалавек.

Нарада ўжо абмеркавала пытанне аб выніках агітацыйнай работы сярод працоўных мас у перыяд выбараў у Вярхоўны Совет СССР і наменціла канкрэтныя мерапрыемствы па яе замацаванню.

На зачэрнім пасяджэнні 20 студзеня нарада заслухала даклад загадчыка аддзелам агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б тав. Бедзіна аб становішчы партыйнай прапаганды.

Паведамленне

Сёння ў 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Дома ўрада, адбудзецца аб'яднанае пасяджэнне ЦК і Менскага гаркома КП (б)Б, ЦВК і СНК БССР, прэзідыума горсовета, ЦК і ГК ЛКСМБ, ЦП профсаюзаў з удзелам стаханаўцаў заводаў і фабрык, прысвечанае 14-й гадавіне са дня смерці В. І. Леніна.

Білеты ў райкомах КП(б)Б і ў гор совеце.

МЕНСКІ ГАРКОМ КП(б)Б.
МЕНСКІ ГОРСОВЕТ.

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ПЕРШАГА СКЛІКАННЯ

ПРАМОВА тав. В. М. МОЛАТАВА АБ УТВАРЭННІ ЎРАДА СССР

(ПРАЦЯГ)

ноўчыя бакі, калі ён гаварыў наконт альпінізма, турызма і шахматнай справы. **(Смех у зале).** Але ў тым-та і справа, што ў наркома юстыцыі былі адзначаны станоўчыя бакі, але зусім не ў галіне работы Наркамюста... А нам трэба, каб Наркамюст працаваў, як узорны совецкі наркамат, на які ўскладзены нашай Канстытуцыяй новыя велізарныя задачы, чаго, на жаль, не аразумеў тав. Крыленка. Відавочна, гэта прыдзецца ўлічыць пры зацвярджэнні складу Совета Народных Камісараў.

Далей — аб рабоце Наркамзага, створанага з Камітэта загатовак. Правільна ўказаў тав. Касіор, што, вылучаючы кіраўніком Камітэта загатовак тав. Кальцова, які мае нямалы мясцовы вопыт, мы разлічвалі на тое, што справы Камітэта загатовак значна палепшацца. Між тым, нозы кіраўнік не зразумеў нават свайго абавязку расчысціць органы Камітэта загатовак ад забраўшыхся туды шкоднікаў і ўсякай драні. Ён не правіў ніякага густу ў гэтых адносінах, не паказаў сябе большэвіком у рабоце. Значыць, прыдзецца пры зацвярджэнні складу Совета Народных Камісараў лічыцца і з гэтым фактам.

Нарэшце, аб Камітэце мастацтваў. Аб ім тут гаварылі двое з выступаўшых дэпутатаў. Абодва дэпутаты крытычна адзываліся аб кіраўніцтве Камітэта мастацтваў, але я сказаў-бы, што іх крытычныя заўвагі былі мінімальнымі. Справа з кіраўніцтвам Камітэта мастацтваў абстаіць у нас даволі нядобра. Колькі мы ні прабавалі дапамагчы цяперашняму кіраўніку — тав. Кержэнцэву выправіць справу, сам ён сапраўднай ініцыятывы і разумення сваіх абавязкаў не правіў. Значыць, трэба ўлічыць і гэту акалічнасць пры зацвярджэнні новага складу Совета Народных Камісараў.

Вось, таварышы, тыя заўвагі, якія я павінен быў зрабіць, перш чым перайсці да абгаворвання складу Совета Народных Камісараў.

Цяпер дазвольце перайсці да складу Ўрада.

Я не спыняюся на пытанні аб Старшыні Совета Народных Камісараў, пераходжу да намеснікаў Старшыні Саўнаркома.

У сучасны момант у нас два намеснікі Старшыні Совета Народных Камісараў, якія разам з тым з'яўляюцца Народнымі Камісарамі. У інтарэсах далейшай работы Совета Народных Камісараў, — а работы ў Саўнаркоме становіцца ўсё больш! — я прашу аб тым, каб намеснікі Старшыні Саўнаркома былі вызвалены ад наркаматскіх пасад і цалкам былі-б заняты работай у Совеце Народных Камісараў.

У адпаведнасці з гэтым, уношу наступныя прапановы:

Зацвердзіць намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў Власа Якаўлевіча **Чубара (бурныя апладысменты)**, з аслабаненнем яго ад абавязкаў Народнага Камісара Фінансаў.

Уношу, далей, прапанову — зацвердзіць намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў Анастаса Іванавіча **Мікояна (бурныя апладысменты)**, з аслабаненнем яго ад абавязкаў Народнага Камісара харчовай прамысловасці.

Уношу таксама прапанову—зацвердзіць яшчэ аднаго намесніка Старшыні Совета Народных Камісараў, назначыўшы яго і Старшынёй Камісіі Совецкага Кантролю — Станіслава Вікенцьевіча **Касіора. (Бурныя апладысменты).**

Прашу зацвердзіць Старшынёй Дзяржаўнай Планавай Камісіі Нікалая Алексеевіча **Вазнясенскага (Апладысменты).**

Народным Камісарам па замежных справах — Максіма Максімавіча **Літвінава. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Унутраных Спраў — Нікалая Іванавіча **Ежова! (Працяглыя апладысменты).**

Народным Камісарам абароны — Клімента Ефрэмавіча **Варашылава. (Бурныя, працяглыя апладысменты, усе ўстаюць, па зале пракатваецца магутнае «Ура таварышу Варашылаву!», «Няхай жыве таварыш Варашылаў!»).**

Народным Камісарам Ваенна-Морскага Флота — Петра Александравіча **Смірнова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Цяжкай Прамысловасці — Лазара Майсеевіча **Кагановіча. (Бурныя, працяглыя апладысменты, воклічы: «Няхай жыве таварыш Кагановіч!», «Ура таварышу Кагановічу!». Усе ўстаюць).**

Народным Камісарам Машынабудаўніцтва — Александра Давыдавіча **Брускіна. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Абароннай Прамысловасці — Міхаіла Майсеевіча Кагановіча. **(Апладысменты).**

Народным Камісарам Харчовай Прамысловасці — Абрама Лазаравіча **Гілінскага. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Лёгкай Прамысловасці — Васілія Іванавіча **Шэстакова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Лясной Прамысловасці — Міхаіла Іванавіча **Рыжова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Шляхоў Зносін — Алексея Венедзіктавіча **Бакуліна. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Воднага Транспарта — Нікалая Іванавіча **Пахомава (Апладысменты).**

Народным Камісарам Сувязі — Матвея Давыдавіча **Бермана. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Земляробства — Роберта Індрыкавіча **Эйхе. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Соўгасаў—Тіхана Александравіча **Юркіна. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Загатовак — Міхаіла Васільевіча **Папова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Фінансаў — Арсенія Грыгор'евіча **Зверава. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Гандлю — Міхаіла Паўлавіча **Смірнова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Знешняга Гандлю — Яўгенія Дзенісавіча **Чэялева. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Юстыцыі — Нікалая Міхайлавіча **Рычкова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Аховы Здароўя— Міхаіла Фёдаравіча **Болдырэва. (Апладысменты).**

Старшынёй Дзяржаўнага Банка — Алексея Петровіча **Грычманава. (Апладысменты).**

Старшынёй Камітэта па справах вышэйшай школы — Сергея Васільевіча **Кафтанава. (Апладысменты).**

Старшынёй Камітэта па справах мастацтваў — Алексея Іванавіча **Назараза. (Апладысменты).**

Таварышы, мне няма неабходнасці дазаць асобныя тлумачэнні аб кіраўніках наркаматаў, імёны якіх я тут агаласіў. Вы і без таго іх добра ведаеце.

Совету Народных Камісараў, які будзе вамі зацверджан, належыць вялікая работа, прадстаіць рашэнне яшчэ больш складаных задач, чым было да гэтага часу. Расце наша справа, растуць і нашы задачы.

Мне прышлося ўжо гаварыць аб крытычных заўвагах, якія былі зроблены дэпутатамі ў адносінах асобных наркаматаў. Нельга не прызнаць, што за работу наркаматаў адказвае Саўнарком, а таму павінна быць ясна, што крытычныя заўвагі аб рабоце наркаматаў адносяцца ў вядомай меры і да самога Саўнаркома. Зробленыя заўвагі павінны быць улічаны ўсімі наркаматамі і Урадам у цэлым.

Крытыку недахопаў наркаматаў Саўнарком разглядвае і будзе разглядваць, як дапамогу і падтрыманне ў яго рабоце. З гэтай крытыкі мы павінны зрабіць вывад — значыць Саўнарком павінен яшчэ больш і значна лепш дапамагаць больш слабым наркаматам, узмацніць свой кантроль у адносінах іх работы, своечасова замяняць неадпавядаючых справе кіраўнікоў.

Кіраўнікі, якія стаяць на высокіх дзяржаўных пастах, не павінны адзавацца зазнайству або самазадаволенню, павінны сур'ёзна прыслухоўвацца да крытыкі, павінны ўдасканальвацца ў рабоце. Зазнайства, якое выражаецца ў такім прадстаўленні: «Я высока стаю і таму я ўсё бачу і ўсё ведаю», — мы павінны асудзіць, як палітычную блізарукасць, як чванства, як бюракратызм.

Лепш будзе, таварышы, калі мы будзем памятаць зыдатныя словы таварыша Сталіна, сказаныя ім нядаўна на прыёме металургаў і гарнякоў:

«Быць кіраўніком у совецкіх умовах — значыць удастоіцца высокага гонару і давер'я ў вачах народа... Кіраўнікі прыходзяць і ўходзяць, а народ астаецца. Толькі народ бессмяротны. Усё астатняе — прэхадзячае. Таму трэба ўмець даражыць давер'ем народа». **(Апладысменты).**

«Умець даражыць давер'ем народа» — такі асноўны абавязак Совета Народных Камісараў, такі асноўны абавязак кожнага з дзяржаўных кіраўнікоў.

Выбары ў Вярхоўны Совет і ўмацаваўшыйся за гэты час блок комуністаў і беспартыйных адкрываюць новую старонку ў гісторыі нашай краіны, у гісторыі социялізма. Вярхоўнаму Совету, выбранаму пераможным блокам комуністаў і беспартыйных, мы павінны заявіць: «Мы, кіраўнікі — **комуністы,** якія ведаюць, што поспех нашай работы будзе тым значней, чым больш і чым мацней будзе ажыццяўляцца наша штодзённая і жывая сувязь з шматмільённымі **беспартыйнымі** масамі працоўных. **(Апладысменты).**

У нас у Совецкім Саюзе склалася нябачанае раней і не існуючае ў іншых краінах, дзе капіталізм раздзірае грамадства на класы, — у нас склалася на аснове перамогі ўлады працоўных маральнае і палітычнае адзінства народа, таму што ў нашай краіне зблізіліся і злучыліся ў адно цэлае дзве вялікія сілы: народ і комунізм. **(Бурныя апладысменты).**

Усё гэта накладвае на нас, на кіраўнікоў, вялікія абавязкі. Каб зразумець гэтыя абавязкі, мы павінны памятаць аб тым, што гаварыў тазарыш Сталін на сходзе выбаршчыкаў Сталінскай округі ў Маскве напярэдадні выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Совета. Ён гаварыў:

«Выбаршчыкі, народ павінны патрабаваць ад сваіх дэпутатаў, каб яны аставаліся на вышыні сваіх задач, каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абываталяў, каб яны аставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу, каб яны былі такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін **(апладысменты)**, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін **(апладысменты)**, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін **(апладысменты)**, каб яны былі гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін **(апладысменты)**, каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін **(апладысменты)**, каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін. **(Апладысменты»).**

Таварыш Сталін гаварыў далей аб тым, што дэпутаты «павінны мець перад сабой вялікі вобраз вялікага Леніна і падражаць Леніну ва ўсім». **(Шумныя апладысменты).**

Таварыш Сталін прад'явіў гэтыя высокія патрабаванні да дэпутатаў Вярхоўнага Совета. Тым больш усё гэта адносіцца да Народных Камісараў і да Совета Народных Камісараў у цэлым. Мы павінны памятаць аб тым, што Совет Народных Камісараў з самага пачатку яго ўтварэння ўзначальваў Ленін, і павінны імкнуцца да таго, каб быць дастойнымі вучнямі вялікага Леніна, заклаўшага асновы ўсёй нашай справы. **(Шумныя, працяглыя апладысменты).**

Мы хочам быць вернымі памочнікамі нашага настаўніка і правадыра народаў Совецкага Саюза — вялікага Сталіна. Ва ўсіх важных пытаннях мы, Совет Народных Камісараў, звернемся за парадай і за ўказаннем да Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі, перш за ўсё, да таварыша Сталіна. **(Шумная авацыя, усе ўстаюць, воклічы з зала: «Няхай жыве правадыр вялікага совецкага народа вялікі Сталін!», «Правадыру і настаўніку таварышу Сталіну ура!»).**

Вы ведаеце, таварышы, што гэта і па сутнасці і па форме адпавядае нашай вялікай Канстытуцыі. **(Апладысменты).**

Мы хочам быць дастойнымі нашага социялістычнага народнага парламента — Вярхоўнага Совета, хочам быць дастойнымі народа, будуючага сваімі прапоўнымі намаганнямі, самаадданасцю і творчым энтузіязмам, наперакор усім і ўсякім перашкодам, комуністычнае грамадства. **(Шумныя апладысменты).**

У заключэнне скажу словамі таварыша Сталіна: «Што датычыць нас, членаў ПК, членаў урада, то няма ў нас іншага жыцця, чым жыццё для нашай вялікай справы, чым жыццё для барацьбы за ўсеагульны дабрабыт народа, за радасць для ўсіх працоўных, для мільённых мас». **(Бурныя, працяглыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Усе ўстаюць. Прывітальныя воклічы па адрасу таварыша Сталіна і Молатава на мовах брацкіх рэспублік і воклічы «Ура!» пракатваюцца па зале).**

ПРАМОВА КАПІТАНА МАСКОЎСКАЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ ЧЫРВОНАСЦЯЖНАЙ СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ тав. Н. Н. ГЕРАСІМАВА

(Пад гукі фанфар у залу ўваходзіць дэлегацыя Чырвонай Арміі і Флота і выстрайваецца ля трыбуны. Бурныя працяжныя апладысменты. Усе ўстаюць. Воклічы «Ура!»).

Дэпутатам Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, сапраўдным народным выбранікам — ад байцоў, камандзіраў і палітработнікаў нашай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі — палкае чырвонаармейскае прывітанне! **(Бурныя апладысменты. Воклічы з месц: «Ура!, Няхай жыве Чырвоная Армія!»).**

Чырвоная Армія асабліва вітае першага дэпутата Вярхоўнага Совета, мудрага правадыра і настаўніка Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. **(Бурныя працяжныя апладысменты. Усе ўстаюць. З месц раздаюцца прывітальныя воклічы ў гонар таварыша Сталіна).**

Чырвоная Армія ганарыцца тым, што яна прымае актыўны ўдзел у палітычным жыцці нашай квітнеючай радзімы. Разам з 170-мільённым совецкім народам, на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі, байцы і камандзіры прымалі ўдзел ў выбарах Вярхоўнага Совета. Чырвоная Армія аддала свае галасы непераможнаму блоку комуністаў і беспартыйных. Яна аднадушна галасавала за міжнародную і ўнутраную палітыку совецкага ўрада, за роднага бацьку і друга—таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты. Усе ўстаюць. Воклічы: «Ура!»).**

Таварышы, ні ў адной краіне свету, апрача нашай краіны социялізма, армія не карыстаецца выбарчым правам. У капіталістычных краінах армія прапінастаўлена народу, яна існуе для падаўлення рабочых і сялян. Толькі ў Совецкім Саюзе армія і народ адзіны. **(Апладысменты).**

Наша армія існуе для абароны кроўных інтарэсаў працоўных, для абароны справы социялізма.

Вось чаму наш совецкі народ бязмежна любіць сваю армію. Вось чаму ён не шкадуе сродкаў на яе ўтрыманне і ўзбраенне. **(Апладысменты).**

Вось чаму Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія з'яўляецца самай магутнай арміяй у свеце. **(Бурныя, працяжныя апладысменты).**

Ва ўсіх краінах, апрача нашай совецкай краіны, на чале арміі стаяць прадстаўнікі эксплаататарскіх класаў, прадстаўнікі капіталістаў і памешчыкаў, графы, герцагі і бароны, — уся капіталістычная знаць адыгрывае кіруючую ролю ў арміі. Што можа быць у іх агульнага з народам, з салдатамі? Нічога. Сама армія прызначана там для прыгнечання ўласнага народа, для захопу чужых тэрыторый, для падняволення слабых, для гвалту над няшчаснымі, па свавольству кіруючых клік. Паміж афіцэрам і салдатам у капіталістычнай арміі ляжыць глыбокае бязлонне класавых супярэчнасцей.

На чале Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі воляй совецкага народа пастаўлен луганскі слесар Клімент Ефрэмавіч Варашылаў **(усе ўстаюць. Бурныя працяжныя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю)**, — непахісны сын партыі Леніна—Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

Чырвоная Армія, усе байцы, камандзіры і палітработнікі горача любяць свайго правадыра, жалезнага наркома і чулага таварыша — Клімента Ефрэмавіча Варашылава. **(Бурныя апладысменты).**

Нашы камандзіры і палітработнікі — плоць ад плоці вялікага працоўнага народа, яго храбрыя і мужныя сыны. Яны камандуюць палкамі, дывізіямі, карпусамі, арміямі. **(Апладысменты).**

Пад кіраўніцтвам роднай большэвіцкай партыі нашы камандзіры і палітработнікі прайшлі ленінска-сталінскую школу палітычнага выхавання, дасягілі велізарных поспехаў у азалоданні складанай ваеннай тэхнікай і тактычным майстэрствам. У радах Чырвонай Арміі дзесяткі Герояў Совецкага Саюза, тысячы байцоў, камандзіраў і палітработнікаў узнагароджаны ордэнамі Саюза ССР. **(Апладысменты).**

Ні адна армія ў свеце не ведала і не ведае такіх камандзіраў і байцоў, якіх мае наша родная, непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія. **(Бурныя апладысменты).**

Несакрушальна сіла Чырвонай Арміі, таму, што ёю кіруе вялікая партыя большэвікоў, сталінскі Цэнтральны Камітэт і Совецкі Ўрад.

Несакрушальна сіла Чырвонай Арміі, таму што яе байцы і камандзіры штодзённа, штогадзінна на сабе адчуваюць цёплыя сталінскія клопаты, якія натхняюць іх на гераізм і подвігі. **(Бурныя апладысменты).**

Несакрушальна магутнасць Чырвонай Арміі, таму што яна тысячамі і тысячамі ніцей звязана з совецкім народам, з'яўляецца яго дзецішчам.

Таварышы дэпутаты! Усё, што совецкі народ мае, усё, чаго ён дабіўся, дасягнута пад кіраўніцтвам слаўнай партыі большэвікоў. Партыю Леніна мы любім, як родную. **(Апладысменты).** Сталінскаму Цэнтральнаму Камітэту і Совецкаму Ўраду мы бязмежна давяраем. **(Бурныя апладысменты).**

Дарагія таварышы народныя выбранікі! Ад імя ўсёй Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі мы запэўняем Вярхоўны Совет і ўвесь совецкі народ, што граніцы нашай вялікай краіны абаронены надзейна. Па першаму ўказанню партыі, урада і таварыша Сталіна **(бурныя апладысменты)** Чырвоная Армія стане на абарону сваёй социялістычнай радзімы і пад чырвонымі сцягамі нашай вялікай партыі Леніна — Сталіна знішчыць ворага на яго ўласнай тэрыторыі. **(Бурныя апладысменты. Усе ўстаюць. Воклічы з месц: «Ура!»).**

Няхай жыве брацкі саюз народаў нашай любімай радзімы!

Няхай жыве вышэйшы орган дзяржаўнай улады — Вярхоўны Совет СССР!

Няхай жыве наш правадыр і настаўнік таварыш Сталін! **(Усе ўстаюць. Бурная, доўгая авацыя ў гонар Чырвонай Арміі і таварыша Сталіна).**

ПРАМОВА ДЭПУТАТА тав. Г. І. ПЕТРОЎСКАГА

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета!

Згодна 114 артыкула Канстытуцыі, які гаворыць: «Пракурор СССР назначаецца Вярхоўным Советам СССР тэрмінам на сем год»—прапаную ад імя совецкіх старайшын Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей назначыць пракурорам СССР тав. Вышынскага Андрэя Януар'евіча. **(Шумныя апладысменты).**

Тав. Вышынскі ўсім вам вядомы па сваіх выступленнях на судовых працэсах супроць ворагаў народа, выкрытых нашымі слаўнымі органамі Наркамунутсправ пад кіраўніцтвам Нікалая Іванавіча Ежова. **(Працяглыя апладысменты).**

Тав. Вышынскі за вялікую работу па ўмацаванню рэволюцыйнай законнасці ўзнагароджан урадам орденам Леніна і орденам Працоўнага Чырвонага Сцяга. **(Апладысменты).**

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета, Сталінская Канстытуцыя ставіць перад органамі пракуратуры і суда велізарныя задачы. Згодна артыкула 113 Канстытуцыі на пракурора СССР ускладаецца «Вышэйшы нагляд за дасканалым выкананнем законаў усімі Народнымі Камісарыятамі і падведамственымі ім установамі, роўна як асобнымі пасадавымі асобамі, а таксама грамадзянамі СССР»...

Поспехі социялістычнага будаўніцтва выклікаюць узмоцненае азлабленне ўнутраных і знешніх ворагаў супроць нашай рабоча-сялянскай дзяржавы. Таварыш Сталін быў абсалютна праў, калі ўказваў, што пакуль мы будзем знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні, ворагі будуць усімі сіламі старацца нам шкодзіць. Яны будуць займацца падрыўной, дыверсійнай работай. Гэта немінуча, і мы павінны аб гэтым памятаць, а органам пракуратуры асабліва трэба быць пільнымі.

Прайшоўшыя нядаўна судовыя працэсы над шкоднікамі, контррэволюцыйнымі трацкісцка-зіноўеўскімі, бухарынскімі і буржуазна-нацыяналістычнымі шайкамі бандытаў, гэтымі фашысцкімі псамі, нямала нашкодзіўшымі ў сельскай гаспадарцы і ў прамысловасці, — паказваюць, што органы пракуратуры павінны яшчэ пільней стаяць на варце рэволюцыйнай законнасці, аберагаць, як зяніцу вока, социялістычную — дзяржаўную і кааператыўна-калгасную ўласнасць ад усіх ворагаў. «Малейшае беззаконне, — пісаў Уладзімір Ільіч,—малейшае парушэнне совецкага парадку ёсць ужо **дыра,** якую неадкладна выкарыстаюць ворагі працоўных».

Цвёрдай рукой дыктатуры пролетарыята, вострым мечам рэволюцыйнай законнасці выкарчуем да канца ўсе варожыя гнёзды, знішчым ушчэнт прэзрэнную, мерзкую контррэволюцыйную гадзіну, дзе-б яна ні была.

Згодна арт. 117 Канстытуцыі: «Органы пракуратуры ажыццяўляюць свае функцыі незалежна ад якіх-бы та ні было мясцовых органаў, падпарадкоўваючыся толькі пракурору СССР». Гэта вельмі важны артыкул. Ён агараджае органы пракуратуры ад якой-бы та ні было залежнасці ад мясцовых органаў улады, з'яўляецца мацнейшым сродкам барацьбы супроць месніцтва, праізвола, сваволля, парушэння Канстытуцыі, парушэння законаў. Тым больш павышаецца адказнасць пракуратуры.

Мы даўно ўжо адышлі ад таго часу, калі многія советы і выканкомы на месцах кожны ў паасобку ўстанаўлівалі свае законы, супроць чаго змагаўся Ленін, указваючы, што «законнасць не можа быць калужская і казанская, а павінна быць адзіная» для ўсіх совецкіх рэспублік.

Аднак, мы не можам сказаць, што на месцах поўнасцю ўжо выкаранены такія з'явішчы. Задача органаў пракуратуры і далей весці рашучую барацьбу за ўмацаванне рэволюцыйнай законнасці. Гэта задача вялікая, але ўдзячная, бо няма і не было такой краіны ў свеце, як наш Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік, краіна перамогшага социялізма, дзе так высока паднята чалавечае дастоінства, дзе законы на справе агараджаюць інтарэсы працоўных, цалкам служаць інтарэсам усяго совецкага народа, выпрацоўваюцца і прымаюцца самім народам.

Зусім не тое было пры старым рэжыме, калі царскія законы, пракуратура, суд аберагалі інтарэсы прыватнай уласнасці капіталістаў, памешчыкаў, кулакоў, эксплаататараў і прыгнятальнікаў.

Ленін аб буржуазна-памешчыцкім судзе пісаў, што ён з'яўляецца: «Тонкай зброяй бязлітаснага падаўлення эксплуатуемых, адстойваючай інтарэсы грашовага мяшка», што гэта «... суд чыноўнікаў з бязгласнымі саслоўнымі прадстаўнікамі», у якім «падтасаваныя сведкі: заводскае начальства, заводскія вартаўнікі, паліцэйскія, збіваўшыя народ, салдаты, страляўшыя ў рабочых. Якая гнусная комедыя!».

Добра вядомы глыбока ўкараніўшыяся ў народзе старыя прыказкі аб абуральнай бяспраўі народа: «Да неба высока, да цара далёка».

«З дужым не барыся, з багатым не судзіся», «Праўда твая, мужычок, але палязай у мяшок», «Калі ў кішэні суха, дык і ў судзе глуха», «Не ідзі ў суд з адным носам, а ідзі з прыносам», «З казною судзіцца, дык лепш утапіцца» — такія былі едкія рускія і украінскія пагаворкі па адрасу старога суда.

У творах Шчэдрына, Чэхава, Гогаля і іншых пісьменнікаў бяслітасна бічуецца і едка высмейваецца царскі суд, бяздушна чыноўнікаў-бюракратаў. Успомніце расказ Чэхава «У судзе», у якім апісваецца, як судзілі селяніна Нікіпая Харламава. У гэтым расказе пісьменнік дае яркую карціну старога царскага суда:

«Пасяджэнне акруговага суда пачалося ў 10-й гадзіне. Да разбірацельства было прыступлена неадкладна, з прыкметнай спешкай. Справы замільгацелі адна за другой і канчаліся быстра, як збедня без пеўчых, так што ніякі розум не змог-бы скласці сабе цельнага карціннага ўражання ад усёй гэтай стракатай, бягучай, як полая вада, масы тварэй, рухаў, прамоў, няшчасняў, праўды, хлусні...».

Колькі тады пры старым рэжыме нявінных чалавечых жыццяў было асуджана такімі судамі на пагібель і няшчасце!

Усё гэта — царскі суд, хабарніцтва, чыноўнічы апарат, які ненавідзеў народ, разам з царскім самадзяржаўем павергнуты ўпрах. Замест старога — створан новы, дзяржаўны совецкі апарат, які карыстаецца давер'ем і любоўю нашага совецкага народа. У корані змяніліся грамадскія адносіны ў нашай краіне, вырас новы чалавек, прасякнуты совецкім патрыятызмам, бязмежнай любоўю да сваёй социялістычнай радзімы, комуністычнай партыі і нашага правадыра таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

Сталінская Канстытуцыя, самая дэмакратычная канстытуцыя ў свеце — закон усіх законаў — яшчэ больш згуртавала ўсе народы СССР у адзіную, магутную, непераможную сям'ю і як маяк асвятляе шлях працоўных мас усяго земнага шара да комунізма. Яна ва славу ўспяваецца ўсімі народамі Совецкага Саюза.

Пад сцягам партыі Леніна—Сталіна, з вялікай Сталінскай Канстытуцыяй краіна Советаў пойдзе да новых перамог, і ў магучай социялістычнай дзяржаве, я мяркую, органы пракуратуры, суда і таварыш Вышынскі на пасту пракурора СССР зоймуць падабаючае ім месца. **(Бурныя апладысменты).**

МАЯ СУСТРЭЧА З ВЯЛІКІМ СТАЛІНЫМ

Дзень 19 студзеня ўвойдзе ў маю біяграфію, як самы шчаслівы і радасны дзень у маім жыцці. Мне аказалі вялікі гонар — даручылі вітаць першую Сесію Вярхоўнага Совета СССР, першага дэпутата совецкага народа, роднага бацьку і друга працоўных — Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна ад рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі і пагранічнікаў Совецкай Беларусі.

У 2 гадзіны дня 19 студзеня я ў ліку дэлегацыі ад Совецкай Беларусі прышоў у Крэмль. Усведамленне таго шчасця, якое на маю долю выпала, вельмі хвалявала. Хацелася лепш перадаць пачуцці любві і адданасці беларускага народа свайму правадыру, партыі Леніна — Сталіна.

У 5 гадзін 10 мінут старшынствуючы тав. Андрееў прадаставіў мне слова. Наша дэлегацыя ўвайшла ў Крэмлёўскую залу апранутая ў нацыянальныя касцюмы. Усе ўдзельнікі Сесіі горача віталі нас апладысментамі. Я ўзышоў на трыбуну і, як мог, выказаў свае поўныя захаплення пачуцці і пачуцці ўсяго беларускага народа, да канца адданага сваёй социялістычнай радзіме і таварышу Сталіну. Калі я закончыў сваю прамову, тав. Жданаў сказаў мне, што мяне кліча таварыш Сталін. Няма слоў, каб перадаць свае перажыванні ў тую мінуту. Я падышоў да правадыра і ад усёй душы сказаў: «Дзякуй Вам, таварыш Сталін, за радаснае і шчаслівае жыццё». У адказ на гэта правадыр працягнуў мне руку і сказаў: «Дзякуй і Вам».

Рукапацісканне правадыра выклікала ва мне многа новай энергіі і энтузіязма. Я гару жаданнем новымі вытворчымі поспехамі апраўдаць той вялікі гонар, які мне аказалі. Тое, аб чым я марыў, збылося — я бачыў правадыра, я паціснуў яму руку. Ці можа быць большае шчасце!

КУСКОЎ,
стаханавец завода імя Молатава.

Масква.

ПРАМОВА тав. Ф. С. КУСКОВА

(Стаханавец менскага завода імя Молатава)

(Паяўленне ў залі беларускай дэлегацыі сустракаецца бурнымі, працяглымі апладысментамі).

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета! Рабочыя, калгаснікі, совецкая інтэлігенцыя, байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі, пагранічнікі Совецкай Беларусі перадаюць вам, слаўным выбранікам магутнага і вялікага совецкага народа, палкае большэвіцкае прывітанне. **(Усе ўстаюць. Бурныя, працяглыя апладысменты. Воклічы: «Ура!»).**

Мы прынеслі сюды пачуццё палкай любві, бязмежнай адданасці і ўдзячнасці, свае палкае гарачае прывітанне таму, хто вёў і вядзе нас па ленінскаму шляху, хто ўсё сваё жыццё, увесь свой геній, усю сваю мудрасць аддае для шчасця народа, хто забяспечыў нам шчаслівае, радаснае жыццё, — творцу Канстытуцыі перамогшага социялізма, першаму дэпутату совецкага народа, нашаму роднаму, любімаму бацьку, правадыру, настаўніку і другу ўсіх працоўных — Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Працоўныя Беларусі, праглядаючы пройдзены шлях, параўноўваюць сваё мінулае і сваё сучаснае.

Голад, галеча, беспрацоўе, хваробы, тнёт памешчыкаў і польскіх паноў — такі быў лёс рабочых і сялян у мінулым.

Беларускі народ да Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі не меў права навучацца на роднай мове, не меў праза на сваю школу, друк, літаратуру, мастацтва.

Пры дапамозе слаўнага рускага рабочага класа, пад мудрым кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна Беларуская Совецкая Социялістычная Рэспубліка ператварылася ў рэспубліку сучальнай пісьменнасці, у рэспубліку буйнай социялістычнай прамысловасці і буйнага социялістычнага земляробства, у рэспубліку, дзе квітнее беларуская культура, нацыянальная па форме, социялістычная па зместу.

Вось чаму беларускі народ, які прыслаў нас вітаць Вярхоўны Совет, даручыў нам яшчэ і яшчэ раз заявіць: дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае, радаснае жыццё. **(Апладысменты).**

Нам, выбаршчыкам Менскай гарадской выбарчай округі, а значыць і ўсяму беларускаму народу, вышаў велізарны гонар аддаць свае галасы вернаму саратніку Сталіна, любімцу совецкага народа, слаўнаму палкаводцу нашай роднай, непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, першаму маршалу Совецкага Саюза Клімэнту Ефрэмавічу Варашылаву. **(Бурныя апладысменты, усе ўстаюць).**

Подлыя ворагі народа япона-германскія агенты — трацкісцка-бухарынскія і буржуазна-нацыяналістычныя бандыты, шпіёны і шкоднікі прабавалі сарваць грандыёзнае будаўніцтва социялізма. Яны прабавалі адарваць Беларускую Совецкую Социялістычную Рэспубліку ад вялікага Совецкага Саюза і аддаць яе ў кабалу германскім фашыстам і польскім панам. Ворагі пралічыліся. Беларуская Совецкая Социялістычная Рэспубліка, з'яўлялася і з'яўляецца баявым, несакрушальным фарпостам Совецкага Саюза на заходніх границах. Беларускі народ ніколі не дапусціць, каб панскі бот таптаў совецкую зямлю.

На нястомныя клопаты партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна аб нястомным росце добрабыту працоўных беларускі народ адказвае новым узлётам творчага энтузіязму, далейшай барацьбой за ўмацаванне магутнасці нашай краіны.

Таварышы дэпутаты Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей! Працоўныя Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі даручылі нам запэўніць у вашай асобе ўсе народы нашай неасяжнай радзімы, запэўніць наш совецкі ўрад, запэўніць роднага таварыша Сталіна, што, уступаючы ў трэцюю пяцігодку, беларускі народ гатоў да барацьбы за позныя перамогі комунізма, гатоў да бязлітаснай барацьбы супроць усіх ворагаў народа. Мы будзем Совецкага Саюза ад шпіёнаў і дыверсантаў.

Беларускі народ даручыў нам запэўніць нашага любімага дэпутата — роднага Клімента Ефрэмавіча Варашылава, што мы будзем яшчэ больш мацаваць абароназдольнасць краіны Советаў, акружым яшчэ большай любоўю і клопатамі нашу родную Чырвоную Армію. **(Апладысменты).**

Беларускі народ запраўдае дазер'е і надзеі совецкага народа. Ён верыць у свае сілы, таму што з'яўляецца членам вялікай сям'і народаў Совецкага Саюза. Ён ведае, што Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік перамагаў, перамагае і будзе перамагаць надалей, таму што намі кіруе комуністычная партыя, таму што нас вядзе да перамогі да перамогі наш родны Сталін. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

ПЕРАМОГА СОЦЫЯЛІЗМА Ў НАШАЙ КРАІНЕ—ПЕРАМОГА СПРАВЫ ЛЕНІНА

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ НА ВАРЦЕ ЗАВЕТАЎ В. І. ЛЕНІНА

21 студзеня 1924 г. перастала біцца сэрца геніяльнага правадыра сусветнага пролетарыята, генія чалавецтва, надзеі прыгнечаных усяго свету.

У цяжкае, неапісуемае гора паверг нута была ўся краіна, увесь пролетарскі свет, уся партыя незваротнай утратай правадыра. У жорсткі мароз мільёны працоўных хавалі свайго настаўніка, друга, правадыра. Мільёнамі гулкоў заводаў і фабрык суправаджаў рабочы клас у апошні шлях генія сусветнай пролетарскай рэвалюцыі. На 5 мінут замерла ўся краіна. Краіна апранулася ў жалобу. Але не дрогнула сэрца партыі. Памёр Ленін. Але жыве справа Леніна, жыве ленінізм. У гістарычнай клятве на 2 Усесаюзным з'ездзе таварыш Сталін гаварыў: «Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам умацоўваць і расшыраць Саюз рэспублік. Клянемся табе, таварыш Ленін, што мы выканаем з гонарам і гэту запаведзь».

Чырвоная Армія — армія дыктатуры пролетарыята. Імя Леніна неадлучна ад Чырвонай Арміі. Ад баявых дружыч 1905 г., ад чырвонагвардзейскіх атрадаў 1917 г. — Чырвоная Армія, пад кіраўніцтвам партыі, верная заветам Леніна, вырасла ў шматмільённую несакрушальную сілу ў перыяд грамадзянскай вайны, разграміўшы белагвардзейцаў і інтэрвентаў.

Пасля сканчэння грамадзянскай вайны Чырвоная Армія прайшла перыяд рэканструкцыі на базе новай тэхнікі. Ленінская мара аб 100 тысячах трактараў ажыццёўлена. Пад кіраўніцтвам геніяльнага вучня, бліжэйшага саратніка Леніна, таварыша Сталіна наша краіна ператварылася ў магутную індустрыяльную дзяржаву, і Чырвоная Армія атрымала магутную сучасную тэхніку, ад ручных кулямётаў да магутных гармат, дрэдноўтаў і самалётаў.

Таварыш Ленін гаварыў: «Хто цалкам і беззаветна не дапамагае Чырвонай Арміі, з усіх сіл і сродкаў не мапуе дыспыпліну ў ёй, той здраднік і прадажнік».

Верная заветам Леніна, Чырвоная Армія, ведаючы, за што яна змагаецца, моцна звязаная з рабочымі і сялянамі шматнацыянальнага Совецкага Саюза, выхаваная на ідэі брацтва і дружбы ўсіх народаў нашай неасяжнай радзімы, выхаваная на ідэі інтэрнацыяналізма, у луху адзінства інтарэсаў рабочых усіх краін, ператварылася ў магутную, з жалезнай, свядомай дысцыплінай, аснашчоную перадавой тэхнікай, сучасную першакласную армію.

Чырвоная Армія вырасціла ў сваіх радах новыя кадры стаханаўцаў баявой падрыхтоўкі, герояў Совецкага Саюза. Усёй краіне вядомы імёны гордых сокалаў нашай краіны, імёны Громава, Юмашова, Даніліна, зрабіўшых гістарычны пералёт з Масквы ў Амерыку праз Паўночны полюс; імёны Чкалава, Байдукова, Белякова, Каманіна, слаўных пагранічнікаў Агеева, Чапуркова, Чэрных, герояў Совецкага Саюза тт. Хальзунова, Паўлава, Пятрова, Дзянісава і іншых.

Совецкі народ бязмежна любіць Чырвоную Армію, армію дыктатуры пролетарыята. «Выбіраючы ў Вярхоўны Совет вялікую групу прадстаўнікоў Чырвонай Арміі — радавых чырвонаармейцаў, камандзіраў, палітработнікаў, кіраўнікоў Чырвонай Арміі, совецкі народ на ўвесь свет заявіў: «Чырвоную Армію любім бязмежна, Чырвоную Армію мацаваць і будзем мацаваць, бо Чырвоная Армія ахоўвае нашу мірную працу, стаіць на варце нашых граніц» (з прамовы старшыні Мандатнай Камісіі т. Шчэрбакова).

Выконваючы заветы Леніна, Вярхоўны Совет прыняў гістарычную пастанову аб арганізацыі наркамата Ваенна-Марскога Флота.

Прайшло чатырнаццаць год з дня смерці таварыша Леніна. Чырвоная Армія, пад кіраўніцтвам партыі, правадыра партыі таварыша Сталіна, маршала Совецкага Саюза тав. Варашылава верная заветам Леніна, ператварылася ў магутную, несакрушальную сілу.

«Ні адной пядзі чужой зямлі не хочам, але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі, не аддадзім нікому». **(Сталін).**

«Калі капіталісты нападуць на нас, Чырвоная Армія, армія міру, ператворыцца ў самую нападаючую армію ў свеце і вайну будзе весці на тэрыторыі той краіны, якая адважыцца напасці на нас» (Варашылаў). Чырвоная Армія, узброеная ленінскай тэорыяй, згуртаваная вакол партыі Леніна — Сталіна, маналітным ушэсам стаіць на варце магутнага Совецкага Саюза.

Капітан М. БАБКІН.

Да 14-ай гадавіны з дня смерці В. І. Леніна. На здымку: В. І. Ленін на II З'ездзе Советаў. З карціны мастака С. Герасімава. (Цэнтральны музей В. І. Леніна).
Рэпрадукцыя (БСФ).

ЁН ЖЫВЕ

Хто сказаў, што памёр Ленін?
Ён жыве!
У кожным новым пакаленні
жыве,
ў кожным юным парыванні
жыве,
ў пролетарскім згуртаванні
жыве,
ў Канстытуцыі совецкай
жыве,
ў рэвалюцыі сусветнай
жыве,
ў нашай праўдзе беззаветнай
жыве,
ў клятве Сталіна бяссмертнай
жыве,
У нашых буднях і парадах
жыве,
на іспанскіх барыкадах
жыве,
ў нашых воінскіх атрадах
жыве,
ў мудрых сталінскіх дакладах
жыве,
ў кожным дні будоўлі новай
жыве,
ў спадарожніцкай размове
жыве,
ў галасах фанфар медзяных
жыве,
ў перамогах нашых слаўных
жыве,
ў лепшых думах мас народных
жыве,
ў МТС і на заводах
жыве,
ў нашым сэрцы песняй гордай
жыве,
Ленін з намі, — верым цвёрда —
Ён жыве.

(Запісана ў Дагестанскай АССР, пераклад з даргінскай мовы).

МУЗЕЙ І НАРОД

Ні адзін маскоўскі музей не карыстаецца такой папулярнасцю, як музей Леніна. У велізарнага чырвонага дома на плошчы Рэвалюцыі амаль заўсёды можна бачыць вялікія групы людзей, якія накіроўваюцца ў музей. Сярод іх рабочыя і калгаснікі, прафесары і інжынеры, піонеры і старыкі.

У манументальным чырвоным доме сканцэнтравана і выстаўлена для агляду шырокіх мас велізарная колькасць ленінскіх рукапісаў, фатаграфій, асабістых дакументаў, першых выданняў ленінскіх работ, рысункаў, гравюраў, карцін і скульптур, прысвечаных Ільічу. Праходзячы па залах, наведвальнік мае магчымасць паслядоўна знаёміцца з рознымі этапамі біяграфіі Леніна і бачыць, як вырастае велізарнейшы чалавек эпохі— правадыр міжнароднага пролетарыята. Наведвальнік бачыць, як ствараецца і выпеставаная Владзімірам Ільічом большавіцкая партыя і Комуністычны Інтэрнацыянал, як у баях паспявае і перамагае вялікая пролетарская рэвалюцыя.

Рукапісы, напісаныя ленінскім почаркам, планы і заметкі Владзіміра Ільіча уводзяць вас у лабараторыю ленінскай барацьбы. Падкрэсленыя словы, заметкі на палях — усё гэта Ільіча, напісана яго рукой. Гэта адразу разумее, глыбока адчувае кожны, хто бліжэй знаёміцца з ленінскімі дакументамі. Шматлікія фатаграфіі, карціны і скульптуры буйных майстраў, нарэшце, дакументальнае афармленне, пры дапамозе якога падкрэслены найбольш важныя ленінскія дакументы — усё гэта ўзмацняе пачуццё блізасці да Леніна.

Праўдзіва і ярка адлюстроўваючы жыццё Владзіміра Ільіча, музей паказвае слаўную гісторыю партыі Леніна — Сталіна. Тут няма месца схаластыцы і фармалізму. Разглядаючы матэрыялы, наведвальнік дакладна бачыць, адчувае пяснейшыя перапляценні і неразрыўную сувязь жыцця і барацьбы Леніна з жыццём і барацьбой яго бліжэйшага саратніка — таварыша Сталіна.

У дні перамог і кароткачасовых паражэнні, у падпольным гуртку і ў далёкай Сібірскай высылцы, на важнейшых франтах грамадзянскай вайны, у руля пролетарскай дыктатуры, у барацьбе з ворагамі, апартуністамі і здраднікамі — Іудам-Троцкага і яго прыспешнікаў Зіноўевым і Каменевым,—заўсёды Сталін побач з Леніным. Усё гэта ярка бачыць і адчувае кожны, хто пабываў у музеі.

Наведвальнік бачыць, як Ленін і Сталін падымалі і згуртоўвалі вакол сябе найшырэйшыя масы працоўных, як у барацьбе ствараліся многамільённая армія будаўнікоў сацыялізма, якія ідуць за партыяй, за правадыром народа Сталіным.

Музей — помнік Леніну, створаны па ініцыятыве таварыша Сталіна, — магутная зброя прапаганды ленінізма і гісторыі партыі. Дастаткова звярнуцца да водгукаў, каб зразумець вялікае значэнне музея. У сваіх водгуках працоўныя горача дзякуюць таварыша Сталіна за стварэнне Цэнтральнага музея Владзіміра Ільіча. Вось некаторыя з гэтых водгукаў:

«Дзякуем таварыша Сталіна за тое, што ён захаваў для нас дарагія ўспаміны».

«Знаёмячыся з матэрыяламі, — піша адзін з рабочых завода «ПАГІ», — я адчуваў як быццам-бы хаджу з Леніным, і ён мне расказвае, дзе жыў і як жыў». У гэтых словах выказаны глыбокія пачуцці і любоў да вялікага тварца нашай партыі.

За адзін толькі 1937 год музей наведала 995 тысяч 275 чалавек. Ні да аднаго музея няма такога вялікага інтарэсу як да музея Леніна. Гэта зусім не дзіўна, бо ён дапамагае пазнаць гісторыю партыі, бо ён дапамагае паставіць прапаганду гісторыі партыі так як гэтага патрабуе Цэнтральны Камітэт партыі і таварыш Сталін. Музей дапамагае перамагчы астаткі схаластыкі і фармалізма ў вывучэнні гісторыі партыі.

Група дэпутатаў Вярхоўнага Совета ад Украіны, якая наведала музей, піша:

«Незабыўнае ўражанне зрабіў на нас музей Леніна. Перад намі стаў вобраз вялікага правадыра працоўных Владзіміра Ільіча Леніна, падражаць якому заклікаў таварыш Сталін усіх дэпутатаў Вярхоўнага Совета. Мы ўбачылі, як велика была любоў Леніна да народа, як адданы ён быў партыі, як бязлітасна ён змагаўся з ворагамі народа. Усё гэта заклікае нас быць такімі, якім быў Ленін. Гэта ўказанне правадыра народаў таварыша Сталіна мы ператворым у жыццё».

Музей Леніна мае вялікае міжнароднае значэнне. Брацкія компартыі пачалі разгортваць работу па збору матэрыялаў для музея. «Паказаць усё жыццё Леніна — гэта вялікая справа тысяч працоўных, — піша швейцарская комуністычная газета «Кемпфер», — таму і рабочы клас Швейцарыі, у баявых радах якога Ленін стаяў у годы вайны, павінен укласці свой камень у гэты вялікі выдатны інтэрнацыянальны помнік».

Р. М. МАКСІМАВА.

БЫЦЬ ТАКІМ, ЯК ЛЕНІН

Хто сказаў, што памёр Ленін?
Ён жыве!..

Сесія Вярхоўнага Совета закончыла сваю работу. Ужо зараз можна падвесці некаторыя ітогі работы сесіі, у прыватнасці, па пытанню аб стылі работы совецкага парламента. Вярхоўны Совет на першай Сесіі паказаў, як трэба ажыццяўляць на справе ўказанні вялікага правадыра і справы Леніна— таварыша Сталіна аб тым, як трэба працаваць.

Яснасць, пэўнасць, дакладнасць, пралуманасць — вось асноўныя рысы прынятых рашэнняў. Ва ўсіх рашэннях чырвонай ніццю праходзіць любоў да сацыялістычнай радзімы. Усе рашэнні накіраваны на ўмацаванне абароназдольнасці нашай радзімы, забеспячэнне мірнай працы, забеспячэнне шчаслівага жыцця ўсяго совецкага народа. Выбраннікі народа ў сваіх рашэннях паказваюць, што яны любяць свой народ, як любіў яго Ленін.

Я прадумваю свае задачы на бліжэйшы перыяд часу. У сваёй рабоце буду кіравацца асноўнай думкай аб тым, што дэпутат — слуга народа, якому ствараюцца ўсе ўмовы для выканання сваіх абавязкаў.

Я лічу неабходным дэталёва вывучыць сваю выбарчую акругу, становішча яе, з тым, каб высунуць для вырашэння тыя ці іншыя пытанні і з тым, каб я, як палітычны дзеяч, мог арыентавацца і прымаць пэўныя рашэнні па пытаннях, якія будуць стаяць перада мной выбаршчыкі.

Я лічу неабходным для сябе яшчэ глыбей, чым да гэтага часу вывучыць палітычныя пытанні для таго, каб быць у стане выканаць паралу таварыша Сталіна аб тым, што трэба быць «такімі-ж яснымі, пэўнымі дзеячамі, як Ленін», каб быць «такімі-ж бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін», каб быць «свабодным ад усякай паніки, як быў свабодны Ленін».

Г. Я. БЕЛКІН,
прафесар Віцебскага ветінстытута,
дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

БУДУ ВЫХОЎВАЦЬ МОЛАДЗЬ У ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКІМ ДУХУ

Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна наша краіна свята выконвае ленінскія заветы. Пад сцягам ленінізма яна пераможна ідзе наперад да комунізма.

Верны прадаўжальнік справы Леніна вялікі Сталін, прыняўшы з рук Леніна спяг барацьбы за сацыялізм, адстаяў ленінскае вучэнне ў барацьбе з варожымі антыленінскімі групамі і забяспечыў перамогу сацыялізма ў нашай краіне.

Таварыш Сталін, з'яўляючыся ўзорам як трэба працаваць па-ленінску, вучыць і нас гэтаму. Зусім чотка ён сфармуляваў задачы дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР на перадвыбарчым сходзе Сталінскай выбарчай акругі. Ён ахарактарызаваў асноўныя якасці палітычнага дзеяча ленінскага тыпу, якім павінен быць дэпутат. Гэтыя ўказанні правадыра будуць служыць мне пастаянным кіраўніцтвам у практычнай рабоце. Я буду працаваць так, каб быць дастойным звання палітычнага дзеяча ленінскага тыпу. У прыватнасці, я, як выкладчык, прыкладу ўсе сілы і веды, каб яшчэ хутчэй рушыць уперад справу народнай асветы ў нашай рэспубліцы, каб выкарчаваць да канца ворагаў і шкоднікаў на культурным фронце. Я буду выхоўваць маладое пакаленне ў ленінска-сталінскім духу.

В. П. ІВАНОЎ,
дэпутат Вярхоўнага Совета СССР,
настаўнік Быхаўскага раёна.

БУДУ ПРАЦАВАЦЬ ТАК, ЯК ЛЕНІН—СТАЛІН

У дзень смерці найвялікшага генія чалавецтва В. І. Леніна я разам з усёй краінай і дэлегатамі 2-га з'езда Советаў перажываў вялікую страту нашай краіны і ўсяго міжнароднага пролетарыята. Калі на з'ездзе таз. Калінін паведаміў аб смерці Владзіміра Ільіча, я быў патрасён гэтым нечаканым цяжкім ударам.

Талы-ж на з'ездзе выступіў І. В. Сталін з клятвай захоўваць Леніна заветы. Прайшло 14 год. За гэты час пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна заветы Ільіча паспяхова праводзяцца ў жыццё. Наша краіна стала магутнейшай краінай у свеце, яна атрымлівае перамогу за перамогай па шляху пабудовы комунізма.

Сёння, калі наша краіна, працоўныя масы ўсяго свету адзначаюць дзень смерці найвялікшага правадыра, генія чалавецтва В. І. Леніна, я, як дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, яшчэ і яшчэ раз успамінаю мудрыя словы вялікага прадаўжальніка справы Леніна—І. В. Сталіна, сказаныя ім на перадзвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай акругі аб задачах дэпутатаў.

Таварыш Сталін паставіў перад намі задачу быць палітычнымі дзеячамі ленінскага тыпу. Гэта вялікая і ганаровая задача. Як працаваць па-ленінску, нам штодзённа паказвае прыклад таварыш Сталін. Іменна таму наша краіна ідзе ўсё наперад па шляху да комунізма.

Працуючы ў пагранічнай акрузе, я буду рабіць усё для далейшага ўмацавання совецкіх граніц. Лепшым сродкам для гэтага з'яўляецца далейшы рост эканомікі, заможнасці і культуры працоўных, дапамога пагранічнікам у ахове граніц.

На ажыццяўленне гэтых задач я буду працаваць, не пакладаючы рук. Не пакідаю сваіх сіл для таго, каб апраўдаць вялікае давер'е народа, які выбраў мяне дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР, буду працаваць па-ленінску, як вучыць нас дарагі Сталін.

СЕДЫХ В. Я.,
старшыня Полацкага акрвыканкома, дэпутат Совета Нацыянальнасцей ад Полацкай выбарчай акругі.

Л. МІХАЙЛАЎ

ТАРЖАСТВО ЛЕНІНІЗМА

Чатырнаццаць год назад памёр вялікі геній рэвалюцыі Ленін, але справа Леніна жыве, квітнее і перамагае пад кіраўніцтвам бліжэйшага саратніка Леніна — таварыша Сталіна. Мы перамагаем, громячы ворагаў, перамагаючы труднасці, таму што заўсёды зерны ленінізму, таму што вялікі Сталін няўхільна і настойліва, цвёрда і ўпэўнена вядзе краіну сацыялізма па ленінскаму шляху.

***

Ленін марыў аб магутнай, багатай сацыялістычнай Расіі. Апошнюю сваю прамову на пленуме Маскоўскага Совета Ленін закончыў сапраўды гістарычным заклікам: «... З Расіі непаўскай будзе Расія сацыялістычная».

— Падыйсці да сацыялізма, ва што-б та ні стала падыйсці, пабудаваць сацыялізм — для гэтага ў нас ёсць усе магчымасці, — вось што настойліва прапагандыразаў Ленін.

Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна партыя ажыццявіла ленінскую праграму пабудовы сацыялізма ў нашай краіне. Наносячы знішчаючыя ўдары ворагам, партыя выкрыла рэстаўратарскую, капітулянцкую сутнасць трацкісцка-бухарынскай агентуры буржуазіі, Трацкісты, зіноўеўцы, бухарынцы, выконваючы шпіёнскую, дыверсійную ролю, прабавалі пасеяць сярод працоўных нязер'е ў свае сілы, пакінуць іх на пасіўнасць, на бяздзейнасць і тым самым расчысціць поле дзейнасці для капіталізма.

Таварыш Сталін разграміў буржуазную, контрэвалюцыйную тэорыю адмаўлення магчымасці перамогі сацыялізма ў адной краіне, у шмат разоў узбагаціўшы ленінскае вучэнне аб пабудове сацыялізма ў адной краіне. Таварыш Сталін запаліў масы энтузіязмам для вялікага будаўніцтва. Ленінска-сталінская праграма пабудовы сацыялізма ажыццёўлена.

Калі Ленін памёр, таварыш Сталін даў вялікую гістарычную клятву. Гэта клятва выканана: слова таварыша Сталіна праведзена ў жыццё.

Вялікі будынак сацыялістычнага грамадства ў СССР пабудаван, эксплаатацыя чалавека чалавекам назаўсёды ліквідавана. Эканамічнай асновай нашай дзяржавы з'яўляецца сацыялістычная ўласнасць. Сацыялізм у нашай краіне перамог канчаткова і беспаваротна. Сацыялізм — гэта ўжо не мара, а жывая рэальнасць, гэта — наша жыццё, — гэта Сталінская Канстытуцыя.

***

Асновай сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі з'яўляецца цяжкая індустрыя. Ленін вучыў, што без цяжкай індустрыі мы не маглі-б існаваць, як самастойная краіна, мы не маглі-б пабудаваць сацыялізма. Таварыш Сталін прыцягнуў увагу ўсёй партыі, усяго народа да справы індустрыялізацыі краіны. На XIV з'ездзе партыі, у канцы 1925 года, таварыш Сталін абвясціў гістарычную праграму індустрыялізацыі, праграму забеспячэння тэхніка-эканамічнай незалежнасці СССР.

Правакатары, двурушнікі, шпіёны, шкоднікі — Троцкі, Бухарын, Рыкаў, Зіноўеў, Каменеў, Пятакоў і іх гнусныя прыспешнікі са скуры лезлі вон, каб сарваць правядзенне сталінскай праграмы індустрыялізацыі. Лазутчыкам буржуазіі трэба было за што-б та ні стала абязброіць Совецкую краіну перад тварам імперыялізма і тым самым падрыхтаваць рэстаўрацыю капіталізма ў нашай краіне. Іх мярзотныя планы раскрыў таварыш Сталін.

Аглядаючы гістарычны шлях, пройдзены краінай Советаў, мы яшчэ і яшчэ раз упэўніваемся, як вяжна было своечасова ажыццявіць індустрыялізацыю нашай краіны. У параўнальна кароткі гістарычны тэрмін працоўныя СССР пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў стварылі магутную цяжкую індустрыю, забяспечваючую абароназдольнасць краіны. Совецкая індустрыя дае нашай Чырвонай Арміі і ваенна-марскому флоту патрэбную ім колькасць аэрапланаў, танкаў, першакласнае ўзбраенне. Совецкая індустрыя дае калектывізаванай сельскай гаспадарцы сотні тысяч трактараў, мноства камбайнаў, аўтамабіляў, складаных сельскагаспадарчых машын.

Па колькасці прадукцыі наша прамысловасць перавышае зараз даваенны ўзровень больш чым у восем разоў. Адзін толькі Магнітагорскі завод у 1936 годзе даў у два з паловай разы больш чыгуну, чым усе металургічныя заводы Польшчы. Магнітагорскі і Кузнецкі заводы ў тым-жа годзе далі на 30 проц. больш чыгуну, чым усе заводы Японіі. Тры чвэрці ўсёй прамысловай прадукцыі СССР выпускаецца заводамі, пабудаванымі або поўнасцю рэканструяванымі совецкай уладай. Наша сацыялістычная прамысловасць па колькасці прадукцыі вышла на першае месца ў Еўропе. Наша краіна з убогай, бяссільнай стала магутнай і багатай краінай сацыялізма.

***

Ленін нястомна вучыў узмацняць саюз рабочых і сялян. У ім Ленін бачыў залог непераможнай сілы совецкага ладу.

У сваёй прамове на 2-м Усесаюзным з'ездзе Советаў таварыш Сталін ад імя усёй партыі пакляўся «ўмацоўваць усімі сіламі саюз рабочых і сялян». Партыя Леніна—Сталіна разграміла спробы трацкісцка-бухарынскай банды сарваць саюз рабочых і сялян. Умацоўваючы гэты саюз, партыя забяспечыла кіруючую ролю ў ім рабочага класа. Партыя вяла сялянства па шляху сацыялізма, паступова падрыхтоўваючы пераход сялянства да калектыўных форм гаспадарання.

Калі Ленін памёр, калгасы і саўгасы былі ў нас невялікімі астраўкамі ў акіяне дробных сялянскіх гаспадарак. За прайшоўшыя чатырнаццаць год пройдзен гігантскі шлях. Дзякуючы ўпартай, крапатлівай рабоце нашай партыі, дзякуючы сістэматычнай дапамозе сялянству, мы вырашылі найдзяйшую задачу Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Сялянства на сваім уласным вопыце пераканалася ў выгоднасці калектыўнай формы вытворчасці і масамі ў 1929 годзе пачало пераходзіць у калгасы. Па ініцыятыве таварыша Сталіна партыя перайшла ад палітыкі абмежавання кулацтва да палітыкі ліквідацыі кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі. Кулацтва як клас ліквідавана. Амаль усё сялянства перайшло ў калгасы.

Ленін вучыў, што дробнаўласніцкая псіхалогія сялянства можа быць перароблена толькі на базе буйнай машыннай тэхнікі. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна такая база створана. 450 тысяч трактараў, звыш 120 тысяч камбайнаў, да 120 тысяч грузавых аўтамабіляў працуюць зараз у вёсцы.

Прадукцыя земляробства СССР у параўнанні з даваенным часам вырасла ў два разы. Сацыялістычная сельская гаспадарка дабілася ўраджаю зернавых амаль у 7 мільярдаў пудоў. Расце заможнасць калгаснай вёскі, не ведаючай беднасці, не ведаючай памешчыцкай і кулацкай кабалы.

***

Грандыёзны поспехі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Ленін заўсёды вучыў умацоўваць дружбу народаў, Сталін пакляўся ля труны Леніна з гонарам выконваць запаведзь вялікага настаўніка — «узмацняць і пашыраць саюз рэспублік». І гэты ленінскі завет бліскуча выканан дзякуючы геніяльнаму кіраўніцтву таварыша Сталіна.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя знішчыла назаўсёды напяснальны гнёт і прадаставіла поўнае роўнаправе прыгнечаным раней народам. У нацыянальных, раней адсталых, рэспубліках бурна развіваецца сацыялістычная прамысловасць, растуць нацыянальныя кадры кваліфікаваных рабочых. Мацнее дружба роўнаправных народаў СССР.

Гэтыя бліскучыя поспехі сацыялізма знайшлі сваё выражэнне ў Сталінскай Канстытуцыі.

***

Ленінскія газеты бліскуча выканаць перш за ўсё таму, што таварыш Сталін, як і Ленін, заўсёды вучыў непрымірымасці ў барацьбе з ворагамі народа, вучыў бязлітасна граміць і выкарчоўваць іх. У гэтым вялікая сіла большэвізма. Ленін гаварыў: «Наша сіла — поўная яснасць і цвярозасць у ліку ўсіх наяўных класавых велічынь, і рускіх, і міжнародных, а затым вынікаючыя адсюль жалезная энергія, цвёрдасць, рашучасць і беззаветнасць барацьбы... Мы ажураны ўсясветнай буржуазіяй, пільнуючай кожную мінуту імстання, каб вярнуць «сваіх», каб аднавіць памешчыкаў і буржуазію». (Ленін, XXVI том, стар. 347—348).

Барацьба паміж сацыялізмам і капіталізмам абвастраецца. Разведкі капіталістычных, у першую чаргу фашысцкіх краін, засылаюць у Совецкі Саюз шпіёнаў і шкоднікаў для падрыўной работы супроць сацыялізма.

Трацкісцка-бухарынскія мярзаўцы дзяўно ўжо ператварыліся ў банду шпіёнаў і правакатараў, якія прадаліся замежным разведкам. Яны мелі намер цаной распродажу сацыялістычнай радзімы, цаной патокаў крыві рабочых і сялян дабіцца рэстаўрацыі капіталізма ў нашай краіне, ператварэння яе ў калонію імперыялізма.

У дакладзе на лютаўска-сакавіцкім (у 1937 годзе) пленуме ЦК ВКП(б) таварыш Сталін паказаў сучасную тактыку класавых ворагаў, бязлітасна ўскрыў буйнейшыя недахопы ў рабоце партыйных, гаспадарчых і іншых органаў і даў у рукі ўсіх будаўнікоў сацыялізма вастрэйшую зброю для выкрыцця трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў, шкоднікаў, дыверсантаў, забойц.

Пры адзінадушным падтрыманні ўсяго совецкага народа слаўныя наркамунутдзельцы на чале з верным сталінскім наркомам тав. Ежовым бязлітасна выкрываюць і знішчаюць шпіёнскія гнёзды фашысцкіх наймітаў. Але яшчэ не ўсе варожыя гнёзды разароны. Будзем пільнымі! Выкурым шпіёнаў з іх апошніх нор! Знішчым іх без астатку!

***

У сваёй вялікай працы «Дзіцячая хвароба «левізны» ў комунізме» Ленін указаў, што адной з асноўных умоў поспеху большэвікоў з'яўляецца беззаветнае падтрыманне іх усёй масай працоўных.

Партыя Леніна—Сталіна заўсёды перамагала таму, што яна ўмее непарыўна ўзмацняць і памнажаць свае сувязі з масамі працоўных, чарпаць усё новыя і новыя сілы з іх асяроддзя, будзіць багатыя творчыя сілы народа.

Капіталізм губіў народныя таленты. Сацыялізм дае ім поўную магчымасць рассквіту. У совецкай краіне з асяроддзя працоўных выраслі і растуць выдатнейшыя арганізатары сацыялістычнай гаспадаркі, навуковыя дзеячы, дзяржаўныя людзі, выдатнейшыя грамадскія работнікі.

З кожным днём мацнеюць сувязі партыі з народам. Сталінская Канстытуцыя выклікала да жыцця новы гігантскі ўздым актыўнасці працоўных. Гэта ярка праявілася ў часе выбарчай кампаніі ў Вярхоўны Совет: у галасаванні прымалі ўдзел 96,8 проц. усіх выбаршчыкаў. Ніколі ніадна краіна не ведала такой актыўнасці выбаршчыкаў!

За час выбараў працоўныя СССР прадэманстравалі сваю беззаветную адданасць большэвіцкай партыі і совецкаму ўраду. Гэта выразілася ў поўнай перамозе блока комуністаў і беспартыйных. За кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных галасавала на выбарах у Совет Саюза 98,6 проц. і ў Совет Нацыянальнасцей — 97,8 проц. Выбары ў Вярхоўны Совет СССР паказалі велізарнейшае маральнае і палітычнае адзінства совецкага народа.

Гэта адзінства прадэманстравана было таксама на Сесіі Вярхоўнага Совета. Незабыўныя гістарычныя моманты сустрэчы дэпутатаў Вярхоўнага Совета з вялікім Сталіным. Бязмежную любоў да партыі, да Сталіна, выключную згуртаванасць, несакрушальнае адзінства дэманстравалі дэпутаты Вярхоўнага Совета.

***

Перамогі сацыялізма, запісаныя ў вялікай Сталінскай Канстытуцыі, становяцца ўсё больш вядомы працоўным усяго свету. Яны назочна бачаць, на якія вялікія справы здольны працоўныя, стаўшыя гаспадарамі свайго ўласнага лёсу. Расце вера эксплаатуемых усяго свету ў свае ўласныя сілы. Узмацняецца барацьба супроць імперыялізма, супроць фашызма.

Іспанскі народ гераічна змагаецца супроць фашысцкіх орд Франко, Гітлера і Мусаліні. Кітайскі народ усё больш яднае свае сілы супроць крывавага японскага імперыялізма.

Мацнее народны фронт барацьбы супроць фашызма.

Мацнеюць сілы эксплаатуемых усяго свету ў барацьбе супроць імперыялізма.

Ленінізм перамагае! Ленінізм перамажа ва ўсім свеце!

ЛЕНІН—УВАСАБЛЕННЕ ЛЕПШЫХ МАРАЎ ЧАЛАВЕЦТВА

Ленін — гэта імя дорага працоўным усіх краін свету. Ленін будзе вечна жыць у сэрцах усяго чалавецтва таму, што ён уваасабляе ў сябе ўсе лепшыя імкненні і мары лепшых людзей усіх часоў і народаў. Ён геніяльны тварэц Кастрычніка, вялікі пераўтваральнік шостай часткі земнага шара, правадыр прыгнечаных усяго свету. Калі ўшоў ад нас Ленін, яго сцяг падняў Іосіф Вісарыёнавіч Сталін, верны і мудры яго саратнік і прадаўжальнік. Вось ужо 14 год Сталін вядзе нас па ленінскаму шляху, вядзе нас ад перамогі да перамогі, да канчатковай мэты чалавецтва — комунізма.

Раласна ўсведамляць, што ва ўсіх выдатнейшых дасягненнях нашай соцыялістычнай радзімы жыве вобраз Леніна. А нашы дасягненні ва ўсіх галінах матэрыяльнай і духоўнай культуры сапраўды велізарныя, у прыватнасці ў блізкай мне галіне аховы здароўя, асабліва, калі параўнаць з тым, што мы атрымалі ў спадчыну ад парскага рэжыму.

Для ілюстрацыі возьмем хаця-б наш Менск. З'явіліся прыгожыя клінікі з багата абстаўленымі лабараторыямі і рэнтгенаўскімі кабінетамі. Невымяральна вырасла пазабольнічная дапамога. Не было раней зусім дзіцячых устаноў. Цяпер у нас ёсць дзіцячыя клінікі, дзіцячыя кансультацыі. Замест ранейшых двух ясляў з 60 ложкамі, ёсць цяпер 40 з 2.000 ложкамі. Вядзецца шырокая барацьба з рознымі хваробамі, разгортваецца велізарная сетка санаторыяў і дамоў адпачынку.

Мне, як старому медыцынскаму работніку, асабліва радасна бачыць, як ажыццяўляюцца ленінскія клопаты аб людзях, як шмат увагі ўдзяляецца цяпер пытанням аховы здароўя. Якія найвялікшыя сумы грошай адпускаюцца на разгортванне сеткі ўсемагчымых лячэбных устаноў, санаторыяў і курортаў!

У дзень 14-й гадавіны смерці незабыўнага Ўладзіміра Ільіча хачу пажадаць нашай медыцынскай моладзі: вучыцеся ў Леніна жыць і працаваць на карысць народа і сваёй радзімы, авалодвайце ленінізмам, будзьце на сваёй рабоце дастойнымі прадаўжальнікамі ленінскай справы.

Ю. Я. ТУРГЕЛЬ,
кансультант-тэрапеўт менскай цэнтральнай рабочай паліклінікі.



В. І. Ленін на Усерасійскім суботніку ў Крэмлі. Малюнак мастака П. Васільева. (З альбома ІЗОГІЗ'а «Ленін»). Рэпрадукцыя (СФ).

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ Ў МЕНСКУ

ВЫСТАЎКА Ў ДОМЕ ПАРТАКТЫВА

У малой залі і фойэ менскага Дома партактыва адкрылася выстаўка, прысвечаная жыццю і рэвалюцыйнай дзейнасці Ўладзіміра Ільіча Леніна. Штодзенна сюды прыходзяць людзі розных узростаў і прафесій, каб азнаёміцца з вылатнымі дакументамі, якія малююць зобраз геніяльнага правадыра і настаўніка. Выстаўку наведалі ўжо сотні рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, агітатараў, пагранічнікаў, чырвонаармейцаў.

На шасці вялікіх шчытах, якія абцягнуты шаўковай матэрыяй, — любоўна падабраныя і адзеленыя фото і дакументы, прысланыя з маскоўскага музея імя Леніна. Яны аллюстроўваюць жыццё і дзейнасць В. І. Леніна ў перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 года. Гэты адзел пачынаецца фотакопіямі з вялоых карцін мастака М. Сокалава «Поезд Леніна ў Расію 16 красавіка 1917 года».

Кожнае фото, кожны дакумент уваскрашае ў памяці і ярка паказвае кіпучую нястомную работу Ільіча, яго барацьбу за шчасце чалавецтва. На выстаўцы ёсць копіі з карцін мастакоў Бродскага «Ленін на Пуцілаўскім заводзе», Сокалава «Ленін у падполлі ў шалашы каля станцыі Разліў. Ліпень—жнівень 1917 года».

У файэ на задрапіраваных чырвоным матэрыялам шчытах паказана вылатнае жыццё Ўладзіміра Ільіча Леніна. Мноства добра падабраных дакументаў і фото характарызуюць яго работу па стварэнню партыі большэвікоў.

І вось — студзень 1924 года. Краіна Саветаў — у трауры. Ушоў ад нас Ільіч. Працоўныя, схіліўшы баявыя спясі, хаваюць свайго геніяльнага правадыра. Вялікі Сталін гаворыць клятву на магіле Леніна.

Сталін — вялікі прадаўжальнік справы Леніна. Гэта аллюстроўваюць адзелы выстаўкі «14 год без Леніна па ленінскаму шляху» і «Жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна».

Вылатныя дыяграмы і фото малююць велізарныя гістарычныя дасягненні нашай соцыялістычнай радзімы ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, культуры і навуцы, атрыманыя пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў і вялікага Сталіна.

***

У менскім клубе будаўнікоў працытаны тры даклады аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці В. І. Леніна для рабочых-будаўнікоў. 21 і 22 студзеня ў клубе будуць праведзены траўныя вечары, прысвечаныя памяці Ўладзіміра Ільіча. Гурткі мастацкай самадзейнасці падрыхтавалі спецыяльныя праграмы да гэтых вечароў. Харавы гурток выканае любімую песню Ільіча «Замучен тяжелой неволей». У праграме мастацкага чытання — зерны аб Леніну з творчасці народаў СССР.

***

У часцях Менскага гарнізона — у ленінскіх кутках, клубах праведзены даклады і гутаркі аб жыцці і дзейнасці вялікага генія чалавецтва Ўладзіміра Ільіча Леніна. У Н-скай часці арганізавана фотавітрына, прысвечаная Ільічу. Чырвонаармейскі хор падрыхтаваў ля камісарам тав. Гураў, развучвае любімую песню Леніна «Замучен тяжелой неволей».

Вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу праводзіць Дом Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава. Ім былі арганізаваны інструкцыйныя даклады для начсастава, даклачыкаў і комсамольскага актыва гарнізона. У чытальні адкрылася выстаўка «Ленін у літаратуры і выяўленчым мастацтве». 21 студзеня ў Доме Чырвонай Арміі адбудзецца вечар начсастава гарнізона, прысвечаны памяці В. І. Леніна. У праграме вечара: даклад аб жыцці і дзейнасці В. І. Леніна і канцэрт «Ленін у літаратуры і музыцы».

***

21 студзеня ў менскім Палацы піонераў і акцябрат будзе наладжан для піонерскага актыва горада даклад на тэму «14 год без Леніна па ленінскаму шляху». Пасля даклада паказ фільма «Ленін у Кастрычніку». Даклад аб Леніну праслухаюць 23 студзеня піонеры і школьнікі горада. Раніцой 24 студзеня арганізуецца гутарка аб геніі пролетарскай рэвалюцыі В. І. Леніну для акцябрат. Вечарам у гэты-ж дзень для школьнікаў старэйшых класаў — даклад і дэманстраванне кінофільма «Ленін у Кастрычніку».

ЧАСТУШКІ ПРА ЛЕНІНА

Хата чыста і багата,
Сцены ў ёй пабелены.
Не забудзем мы ніколі
Друга-бацьку Леніна.

А за рэчкай на лужочку
Траўка расце зелена.
Да заможнасці прыйшлі мы
Па дарозе Леніна.

Асвятляе сонца поле
Яркімі праменнямі.
Вечным сонцам над зямлёю
Зяве вобраз Леніна.
(Запісана ў Свяцілавіцкім раёне).

На паноў мы працавалі, —
Так было ў стары час.
Родны Ленін, родны Сталін
Прывялі да шчасця нас.

Мы калгас пабудавалі,
Імя Леніна далі.
У калгасе мы шчасліва
І заможна зажылі.

Трактар пашаньку арэ,
Аж да самай цемені.
На грудзях у трактарыста
Зяве ордэн Леніна.
(Запісана ў Смалявіцкім раёне).

Эх, каб мог Ільіч наш родны
Паглядзець, як мы жывем,
Як з яго вучэннем верным
К комунізму мы ідзем,

Як па ленінскай дарозе
Нас вядзе ўпэўнена
Сталін любы, Сталін родны —
Лепшы вучань Леніна.
(Запісана ва Ўраваравіцкім раёне).

ЯК ФЯДОСІЯ НІКІЦІШНА Ў ЛЕНІНА БЫЛА

У нас татка быў кровельшчыкам, працаваў у Смольным, ды перад самай рэвалюцыяй і памёр. Так што і заработная плата асталася неатрыманай. Часовы ўрад з'явіўся, маці пайшла адносна грошай, вярнулася з сорамам. Толькі і спыталі:

«А ты, бабка, бачыла, як жабы скачуць?»

Зіма нас прыціснула, маці гаворыць:

— Усе Леніна хваляць цяпер, ці не схадзіць мне ў Смольны?

Якойсьці раніцою ўстаем — няма старой. Думаем,—на абедні, а яна ў Смольны пайшла... І падумайце! Поўзала, поўзала там па кабінетах, ды на Ўладзіміра Ільіча натрапіла... Піша ён, запівае цукерку халодным чаем...

Яна ніколькі не падумала, што гэта ён сам — тады партрэтаў мала было, — і пытае:

— Вы, судар, па якой галіне: па пісьму ці па разбору?

Ён усміхнуўся:

— Як прыязецца, сударыня. Вам на што?

— Мяне людзі да Леніна накіравалі, да Ўладзіміра Ільіча. Гаварыць, тваю справу, Фядося Нікіцішна, з усіх начальнікаў адзін Ленін можа разблытаць... А я гляджу на Вас, як хутка пішаце і думаю: гэткі пан вельмі пісьменны! — Напэўна ўжо не з апошніх начальнікаў... Дзе мне Леніна шукаць, ці не ўвойдзеце ў маё становішча?

Спакойна ўселася ля яго і коратка далажыла.

Вочы ў яго такімі вясёлымі зрабіліся. Пасмейваецца:

— Верна, Фядосія Нікіцішна... Без Леніна абыйдземся.

Выклікаў супрацоўніка, выметку з кніжачкі даў:

«Таварыш, тэрмінова наладзьце Фядосіі Нікіцішне яе справу».

Маці дамоў прыходзіць і грошы выкладзае:

— Усе начальнікі ў Смольным добрыя! І без Леніна справу зрабілі.

А праз месяц прыносіць з рынку фатаграфічную картку:

— Вось купіла начальніка, з якім у кабінеце сядзела...

Мы зірнулі, ды ахнулі:

Маці, ды гэта-ж Ленін і быў!

НОВЫ ФРАНЦУЗСКІ УРАД

ПАРЫЖ, 19 студзеня. (БЕЛТА). Шатан сфармазаў новы кабінет у наступным складзе: прэм'ер — Шатан, віцэ-старшыня, ён-жа міністр абароны і ваенны міністр — Даладзе, міністр каарынацыі эканамічных і фінансавых мер — Боне, замежных спраў—Дэльбос, унутраных—Саро, фінансаў — Маршандо, морскі — Бертран і інш.

У кабінет, уключаючы намеснікаў міністраў, увахо́дзіць 26 радыкал-соцыялістаў, 5 членаў соцыялістычнага і рэспубліканскага саюза, адзін член арганізацыі «Маладая рэспубліка», належачай да групы «Незалежных левых», і адзін член «Незалежнай левай».

***

ПАРЫЖ, 19 студзеня. (БЕЛТА). Новы глава французскага ўрада Шатан зрабіў журналістам наступную заяву:

— Мне ўдалося ліквідаваць урадавы крызіс. Задачы, якія стаяць перад урадам, вельмі цяжкія. Выконваючы іх, урад будзе клапаціцца, каб выканаць народную волю і ўвязаць яе з задачамі нацыянальнага аздараўлення. Урад будзе займацца ўмацаваннем нашых фінансаў, падрыхтоўкай соцыяльнага заканадаўства, якое забяспечыць мірнае супрацоўніцтва капітала і працы, і абаронай безапаснасці і незалежнасці краіны».

***

ПАРЫЖ, 19 студзеня. (БЕЛТА). Урад Шатана сустракае супярэчлівую ацэнку друку. Рэакцыйны і фашысцкі друк марна прабуе ўтаіць сваё задаваленне вынікам ўраўвага крызісу, але апасаецца нядоўгавечнасці новага кабінета. Як піша Анры дэ Кірыліс у «Эпок»: «Парламенцкая база гэтага ўрада складаецца з 118 радыкалаў і поўсотні рэспубліканскіх соцыялістаў і іншых, не маючы, такім чынам, нават трэці мандатаў у палаце дэпутатаў».

Газета «Эўр» падкрэслівае, што Шатан трымае курс на разрыў з комуністамі.

«Юманітэ» канстатуе, што найшырэйшыя масы працоўных Францыі чакалі іншага ўрада. «Працоўныя масы — піша «Юманітэ» — абураны тым, што французскі і замежны капітал навязвае краіне той ці іншы ўрад. Некаторыя газеты і палітычныя дзеячы паказалі, што ў іх вачах галоўнае ў вырашэнні ўраўвага крызіса ў Францыі заключаецца ў тым, што скажуць англійскія кансерватары, плутакраты і банкіры лонданскага Сіці».

«У дэкларацыі, — піша далей «Юманітэ», — якую агаласіў Шатан, масы не знойдуць водгуку на сваю адпадушную волю. Масы не знойдуць у гэтай дэкларацыі нічога адносна вернасці праграме народнага фронта і ажыццяўлення гэтай праграмы. Яны не знойдуць ніякага спасылання на існаванне народнага фронта ў краіне і нават простага спамінання гэтай арганізацыі.

Мы пераконаны, што воля мільёнаў людзей, якія верацъ у народны фронт, дасць варты адказ тым, хто ёй супраціўляецца. Комуністы будуць працаваць сумесна з соцыялістамі і радыкаламі над умацаваннем народнага фронта. Працоўныя масы імкнуцца захаваць народны фронт. Ён будзе захаван. Працоўныя масы хочуць стварэння ўрада па ўзору народнага фронта, і яны яго атрымаюць».

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

17 студзеня на тэруэльскім участку мяцежнікі атакавалі рэспубліканцаў на поўнач ад Эль Мулетон—важнага стратэгічнага пункту, які пануе над вёскай Канкуд і дарогай у Саратосу і Сорыя.

18 студзеня мяцежнікі прадаўжалі атакі. Першая была прадпрынята з раёна Селалас і другая з боку Канкуда. Абедзве атакі адбіты. У рэзультаце контратакі рэспубліканцы зноў занялі адну вышыню, якую вымушаны былі пакінуць напярэдадні.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Не гледзячы на супраціўленне мяцежнікаў, рэспубліканцы занялі 17 студзеня значную тэрыторыю ў паўночнай частцы правінцыі Гвадалахара (на паўночны ўсход ад Мадрыда), у тым ліку два ўзвышшы.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

Рэспубліканская авіяцыя збіла ў раёне Тэруэля два самалёты. Абодва пілоты мяцежнікаў забіты.

Рэспубліканская авіяцыя ў баях у раёне Тэруэля страціла адзін самалёт.

18 студзеня мяцежнікі зрабілі рад паветраных налётаў на Валенсію, Сагунта і іншыя пункты рэспубліканскага ўзбярэжжа. У Валенсіі забіта 6, паранена 22 чалавекі.

***

Днём 19 студзеня шэсць фашысцкіх самалётаў, прыляцеўшых з востраваў Маёркі, скінулі 80 бомб буйнага калібра над роснымі кварталамі Барселоны. Разбурана некалькі будынкаў. Забіта больш 100 чалавек, галоўным чынам жанчын і дзяцей. Лік раненых таксама вельмі значны. Рэспубліканскія знішчальнікі праследвалі фашысцкія самалёты, якія хутка ўцяклі ў напрамку да мора.

Ноччу на 19 студзеня і раніцай 19-га Валенсія таксама падвергласа новым бамбардыроўкам фашысцкай авіяцыі. Матэрыяльныя страты вельмі значныя. Лік афяр невялікі.

ІСПАНСКІЯ МЯЦЕЖНІКІ ЗАТРЫМАЛІ СОВЕЦКІ ПАРАХОД

ЛОНДАН, 19 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляе гібралтарскае агенцтва «Лойда», 18 студзеня вечарам совецкі параход «Петровскій», які ішоў з Гамбурга ў Батумі, быў спынен у Гібралтарскім праліве ўзброеным тральшчыкам мяцежнікаў і адведзен у Сеуту (Іспанскае Марока).

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОЎ, 18 студзеня. (БЕЛТА). У раёне на поўдзень ад Нанкіна кітайскія войскі дасягнулі ваколіц горада Уху і захапілі прыгарад Чаньсі і чыгуначны вакзал, які знаходзіцца за гарадской сцяной. Японскія войскі адыходзяць ад Уху. Японскія ваенныя судны пад пагрозай бамбардыроўкі з боку кітайскіх самалётаў вымушаны былі адыйсці ад Уху і Луцзяна (на поўдзень ад Уху).

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОЎ, 18 студзеня. (БЕЛТА). Паволле апошніх вестак, у правінцыі Шаньсі кітайскія часці 8-й нацыянальна-рэвалюцыйнай арміі, у раёне на поўдзень ад праходу Няньцзыгуань, напалі на японскую аўтакалону з 90 грузавікоў. Знішчана 25 грузавікоў, захоплены радыёстанцыя, некалькі дзесяткаў вінтовак і многа амуніцыі. 50 японскіх салдат на чале з камандзірам батальёна ўзяты ў палон.

ЗАЯВА КІТАЙСКАГА ЎРАДА

ХАНЬКОЎ, 19 студзеня. (БЕЛТА). Учора кітайскі нацыянальны ўрад апублікаваў заяву, у якой гаворыцца:

«З часу ўзнікнення інцыдэнту ў Люкоуцзяо, у ліпені мінулага года, кітайскі ўрад не раз абвяшчаў аб сваёй гатоўнасці прыйсці да прыязнага вырашэння пытання пры дапамозе любых мірных сродкаў, адпавядаючых міжнароднаму праву. Аднак Японія, не лічачыся з усімі вынікамі, разгарнула ў велізарных маштабах наступленне ў Кітаі і пачала няшчаднае знішчэнне кітайскага народа пры дапамозе наземных, марскіх і паветраных сіл. Мэта ўзброенага супраціўлення Кітая—захаваць яго нацыянальнае існаванне і святасць міжнародных дагавораў. Любыя ўмовы адпаўлення міру, калі яны не адпавядаюць гэтаму асноўнаму прынцыпу, непрымальны для Кітая».

РОСПУСК РУМЫНСКАГА ПАРЛАМЕНТА

БУХАРЭСТ, 19 студзеня. (БЕЛТА). Учора апублікаван каралеўскі дэкрэт аб роспуску парламента, выбранага ў снежні мінулага года. Выбары ў палату дэпутатаў назначаны на 2 сакавіка і ў сенат—на 4 сакавіка.

Намеснік адказнага рэдактара
І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Беларускі Дзяржаўны Драматычны тэатр
72 студзеня Абан. № 9
ВОЧНАЯ СТАЎКА

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
1) ПРАМОВА таварыша МОЛАТАВА аб выбарчым блоку комуністаў і бесп. партыйных.
2) «БЯЛЕЕ ПАРУС АДЗІНОКІ»

Кінотэатр «Пролетарый»
ЛЕНІН У КАСТРЫЧНІКУ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
АЙГУЛЬ

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ПОЎНАЛЕЦЦЕ

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ФЕДЗЬКА

ЗНОЙДЗЕНЫ ДАКУМЕНТЫ на імя Случаніна. Зварачацца ў рэдакцыю «Звязда», пакой 6, да тав. Сляцяна.

ХЛЕБ

(Урывак з аповесці Алексея Талстога)

Была трацяя галзіна ночы. Іван Гара стаяў на варце ля дзвярэй у Смольным. У доўгі карыдор за дзень нацягнулі снегу. Ледзь свяціла лямпачка пад столлю. Пуста. Пальцы прыстывалі да вінтоўкі. На варце ля дзвярэй таварыша Леніна — уволю можна было падумаць на дасугу. Замахнуліся на вялікую справу: такую краінішчу падняць з нявуцтва, усю ўладу, усю зямлю, усе заводы, усе багацці праставіць прапоўным!.. Днём, у гарачны, на людзях лёгка было верыць у гэта. У начную галзіну ў халодным карыдоры пачынала, як быццам, брасць сумненне... Доўгі шлях, ці хопіць сіл, ці хопіць жыцця?

Галавой Іван Гара верыў, а цела прыжаўшае ў дрэнная бекешы, хілілася ў супярэчнасць. З кішэні цягнула пахам печанага хлеба, у жываце пасасвала, але есці на пасту Іван Гара сароміўся.

Злалёк па каменнай лесніцы хтосьці чутна, спускаўся з трэцяга паверху. У карыдоры смутна паказаўся чалавек у шубе, накінутай на плечы, — спяшаючыся ішоў, апусціўшы галаву ў каракулевай шапцы, засунуўшы змёрзшыя рукі ў кішэні штаноў. Іван Гара, калі ён наблізіўся, аблегчана рассунуў вялікі рот усмешкай. Пры позірку на гэтага чалавека прападалі сумненні. Павярнуўшы ключ у дзвярах, ён сказаў:

— Змёрзлі, Ўладзімір Ільіч, пагрэцца прышлі?

З-пад ілба ледзь раскосымі вачыма Ленін зірнуў халодна, потым цяплей, — на скроні набеглі маршчынкі.

— Вось якая штука, — ён узяўся за ручку дзвярэй. — Ці нельга зараз знайсці маншёра, паправіць тэлефон?

— Маншёра зараз не знайсці, Ўладзімір Ільіч, дазвольце, я гляну.

— Так, так, гляньце, калі ласка.

Іван Гара бракнуў прыкладам вінтоўкі, услед за Леніным увайшоў у пёплы, вельмі высокі белы пакой, асветлены голай лямпачкай на блоку пад столлю. Раней (калі Смольны быў інстытутам для благародных дзявіц) тут змяшчалася класная дама, і, як было пры ёй, так усё і асталося у алным кутку — дрэнненькі альховы буфецец, у другім — люстэркавая шафка базарнай работы, выцертыя крэслі ля выцертай канапкі, у глыбіні — невысокая белая перагародка, за ёю дзве жалезныя койкі, дзе спалі Ўладзімір Ільіч і Надзежда Канстанцінаўна. На дамскім аблупленым століку — тэлефон. Ўладзімір Ільіч працяваў у трэцім паверсе, сюды прыходзіў толькі начаваць і грэцца. Але за апошні час часта аставаўся і на ноч—наверсе, ля стала ў крэсле.

Іван Гара прысланіў вінтоўку і стаў зьмухаць на пальцы. Ўладзімір Ільіч — на канапе за круглым столікам — перабіраў спісаныя аркушкі. Не падымаючы галавы, запытаў нягучна:

— Ну, як тэлефон?

— Зараз правім. Нічога немагчымага.

Ўладзімір Ільіч, памаўчаўшы, паўтарыў: «Нічога немагчымага», усміхнуўся, устаў і прыадчыніў дзверцу буфета. На паліцах дзве брудныя талеркі, дзве кружкі і — ні адной сухой корачкі. У іх з Надзеждай Канстанцінаўнай толькі ў лютым звялася ална старушка — глядзець за гаспадаркай. Да гэтага здаралася — увесь дзень не еўшы: то няма кал. то няма чаго.

Ленін зачыніў дзверцу буфета, паціснуўшы плячом — вярнуўся на канапу да аркушыкаў. Іван Гара хіснуў галавой: «Ай, ай, — як-жа так: правадыр — галодны, нікуды не вярта». Асцярожна выцягнуў ломаць іржанога, адламаў палову, другую палову засунуў назад у кішэню, асцярожна падышоў да стала і хлеб паклаў на край і зноў заняўся калупаннем у тэлефонным апараце.

— Дзякуй, — рассеяным голасам сказаў Ўладзімір Ільіч. Прадаўжаючы чытаць, — адламліваў ад кавалка.

Дзверы, вядучыя ў прыёмную, дзе раней змяшчалася ўмывальная для дзявіц і да гэтых пор стаялі ўмывальнікі, — прыадчыніліся, увайшоў чалавек з цёмнымі стаячымі валасамі і моўчкі сеў каля Леніна. Рукі ён сціснуў на каленях — таксама, мабыць, змёрз пад шырокай чорнай блузай. Ніжняя павекі яго бліскапеўшых пёмных вачэй былі прыўзняты, як у таго, хто ўглядаецца ўдаль. Цень ад вусаў падала на рот.

— Пункт погляду Троцкага: вайну не прадаўжаць і міру не заключаць — ні міру, ні вайны, — няголасна, глухавата прагаварыў Ўладзімір Ільіч, — ні міру, ні вайны! Гэтакая інтэрнацыянальная палітычная дэманстрацыя. А немцы ў гэты час угрызуцца нам у горла. Таму што мы ля абароны яшчэ не ўзброены... Дэманстрацыя нядрэнная рэч, але трэба ведаць — чым ты афяруеш дзеля дэманстрацыі.. — Ён алоўкам пастукаў па спісаных аркушыках. — Афяруеш рэвалюцыяй. А на свеце зараз нічога няма важней нашай рэвалюцыі...

Лоб яго сабраўся маршчынамі, скулы пачырванелі ад стрыманага ўзбудлжэння. Ён паўтарыў:

— Палзеі буйней і важней не было ў гісторыі чалавецтва...

Сталін глядзеў яму ў вочы, здавалася, абодва яны чыталі думкі адзін другога. Распусціўшы маршчыны, Ленін перагарнуў спісаныя аркушыкі.

— Другі пункт погляду: не мір, але рэвалюцыйная вайна!.. Гм!.. гм!.. Гэта нашы «левыя»... — Ён хітравата зірнуў на Сталіна. — «Левыя» адчаяна размахваюць картонным мечам, як ашалеўшыя буржуа... Рэвалюцыйная вайна!.. І не праз месяц, а праз тыдзень сялянская армія, невыносна стомленая вайной, пасля першых-жа паражэнняў звергне соцыялістычны рабочы ўрад, і мір з немцамі будзем заключаць ужо не мы, а другі ўрад, штонебудзь накшталт рады з эсэрамі-чэрноўцамі *).

Сталін каротка, пвёрда кіўнуў, не спускаючы з Ўладзіміра Ільіча бліскучых вачэй.

— Вайна з немцамі! Гэта якраз і ўваходзіць у разлікі імперыялістаў. Амерыканцы прапануюць па сто рублёў за кожнага нашага салдата... Не-ж, чэснае слова — не анекдот... Тэлеграма Крыленка з стаўкі (Ўладзімір Ільіч, падняўшы бровы, пацягнуў з кішэні абрыўкі тэлеграфнай ленты): з касцямі, з мясам, — сто рублёў. Чычыкаў даражэй даваў за душу... (Сталін злёгку ўсміхнуўся ў вусы). Мы апіраемся не толькі на пролетарыят, але і на бяднейшае сялянства... Пры цяперашнім становішчы рэчаў яно немінуча адхіснецца ад тых, хто будзе прадаўжаць вайну... Мы, чорт іх дзяры, ніколі не адмаўляліся ад абароны. (Рыжаватымі — вясёлымі і разумнымі, хітраватымі і яснымі вачыма глядзеў на субяседніка). Пытанне толькі ў тым: як мы павінны абараняць нашу соцыялістычную бацькаўшчыну...

Выбраўшы адзін з аркушыкаў, ён пачаў чытаць:

— ... Мірныя перагаворы ў Брэст-Літоўску ўпаўне высветлілі ў сучасны момант — к дваццатаму студзеня восемнаццатага года, — што ў германскага ўрада безумоўна ўзяла верх ваенная партыя, якая, па сутнасці справы, паставіла ўжо Расіі ультыматум... Ультыматум гэты такі: або далейшая вайна, або анексіяністскі мір, гэта значыць мір на ўмове, што мы аддаем усе занятыя намі землі, германцы захоўваюць усе занятыя імі землі і накладаюць на нас кантрыбуцыю, прыкрытую знешнасцю платы за ўтрыманне палонных, кантрыбуцыю, размерам прыблізна ў тры мільярды рублёў, з растэрміноўкай плацяжу на некалькі год. Перад соцыялістычным урадам Расіі паўстае патрабуючае неадкладнага вырашэння пытанне: ці прыняць зараз гэты анексіяністскі мір, ці ўвесці зараз-жа рэвалюцыйную вайну... Ніякія сярэднія рашэнні, па сутнасці справы, тут немагчымы...

Сталін зноў пвёрда кіўнуў. Ўладзімір Ільіч узяў другі аркушык:

— Калі мы заключаем сепаратны мір, мы з найбольшай, магчымай для данага моманту ступені вызваляемся ад абодвух жывучых у варожасці імперыялістычных груп, скарыстоўваючы іх варожасць і вайну, — затрудняючую ім здзелку супроць нас, — скарыстаем, атрымліваючы пэўны перыяд развязаных рук для прадаўжэння і замацавання соцыялістычнай рэвалюцыі... — Ён кінуў аркушык, вочы яго сашчурыліся, лукавай хітрасцю.—Для выратавання рэвалюцыі тры мільярды кантрыбуцыі — не занадта дарагая цана...

Сталін сказаў упоўголаса:

— Тое, што германскі пролетарыят адкажа на дэманстрацыю ў Брэст-Літоўску неадкладным паўстаннем, — гэта адно з меркаванняў настолькі-ж магчымае, як любая фантазія... А тое, што германскі штаб адкажа на дэманстрацыю ў Брэст-Літоўску неадкладным наступленнем па ўсяму фронту, — гэта несумненны факт...

— Зусім правільна... І яшчэ, — калі мы заключаем мір, мы можам адразу абмяняцца вяеннапалоннымі і гэтым самым мы ў Германію перакінем велізарную масу людзей, бачыўшых нашу рэвалюцыю на практыцы...

Іван Гара асцярожна кашляну́ў:

— Ўладзімір Ільіч, апарат працуе...

— Вельмі добра! — Ленін спяшаючыся падышоў да тэлефона. Выклікаў Свердлова. Іван Гара, уходзячы за дзверы, чуў яго вясёлы голас:

— ... Так, так,—«левыя» ламалі стулі на з'ездзе... А ў мяне весткі, што аднаго з іх пеўняў на Пуцілаўскім заводзе ледзь не пабілі за «рэвалюцыйную» вайну... У тым-та і справа: рабочыя вельмі добра адгаюць сабе адчот... Якаў Міхайлавіч, значыцца — заўтра роўна ў галзіну збіраецца ЦК... Так, так... Пытанне аб міры...

Па карыдору да Івана Гары, звонка ў пішыні, топаючы абсацамі па плітах, ішоў чалавек у бекешы і смушковай шапцы.

— Я быў наверсе, таварыш, там сказалі — Ўладзімір Ільіч зышоў уніз, — спяшаючыся прагаварыў ён, падняў да Івана Гары разгараўшыйся ад мароза моцны твар, з кароткім носам і карымі вясёлымі вачыма. — Мне яго тэрмінова, на два словы...

Іван Гара ўзяў у яго партыйны білет і пропуск.

— Ужо не ведаю, Ўладзімір Ільіч зараз занят, сакратар спіць, Надзежда Канстанцінаўна яшчэ не вярнулася, — ён з трудом разбіраў прозвішча на партбілеце. Вугалю ў іх, у'яблаў няма, ці што, на станцыі, — нічога не відаць...

— Прозвішча маё Варашылаў...

— А, — Іван Гара шырока ўсміхнуўся. — Чулі пра Вас... Землякі... Зараз скажу...

*) Чэрноў — лідэр эсэраў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; сакратарыята — 25-138, 20-830; аддзелаў: партыйнага — 21-853, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-856, сельскагаспадарчага — 21-846, культуры — 23-955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-885, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-556, абʼяў — 21-846.

Уп. Галоўлітбела № К—5418. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63.

К. Л. Б.